ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛІПЕНЬ 25 1932 г. № 165 (4417). Год выданьня XV

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Уборцы — бальшавіцкія тэмпы; Т. БРОЎКІН і Е. КАПЛІНСКІ — Ацэнка працадня ў калгасах (2 стар.).

Скарыстаньнем гаспадарчага вопыту брыгадзіраў і лепшых калгасьнікаў—актывістаў—патроім тэмпы на сенажацях (1 стар.)

Вопыт Койданаўскай райашчадкасы пашырыць на ўсе ашчадкасы БССР (1 стар.).

Тарфяніні, ад вас чакае краіна ліквідацыі запазычанасьці ў торфе! (2 стар.).

НАСУСТРАЧ КАЛГАСНАМУ ГАНДЛЮ. На заводах імя Варашылава і «Камунар» работа брыгад па вырабу тавараў шырспажыву не арганізавана (3 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

ТАВ. ЛІТВІНАЎ ЗРЫВАЕ МАСКІ З САБАТАЖНІКАЎ РАЗЗБРАЕНЬНЯ (4 стар.).

Уборцы—бальшавіцкія тэмпы!

У БССР пачалося масавае жніво. Раён за раёнам разгортвае ўборку азімых і ранніх яравых. Па рэспубліцы ўжо ўбрана 23.000 га азімага жыта і 5.965 га ячменю. Разам са збожжавымі пасьпеў і ранні лён. Перадавыя калгасы ільнаводчых раёнаў, разгортваючы жніво, прыступілі і да церабленьня ільну.

Мы ўступілі ў самы адказны этап с.-г. работ, калі ў кароткі час неабходна ўбраць бяз страт азімыя і яравыя пасевы і адначасова фарсаваць сенаўборку, якая на радзе раёнаў разгортваецца вельмі марудна.

БССР у гэтым годзе павінна ўбраць 1.260 тыс. гэктараў азімых, 1.194 тыс. гэкт. яравых і 269.000 гэкт. ільну.

Тэрміны ўборкі раду культур, як жыта, ячменю і раннягa ільну, супадаюць. Уборка ўраджаю бяз страт патрабуе максымуму манэўровасьці і гібкасьці ў рабоце ўсіх зямельна-калгасных арганізацый і кожнага саўгасу і калгасу ў паасобку.

Пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру СССР «аб разьмеркаваньні даходаў у 1932 годзе», якая цалкам выцякае з пастановы партыі і ўраду аб уборачнай кампаніі, калгасным гандлі і інш., стварае новыя дадатковыя стымулы для павышэньня зацікаўленасьці калгасьнікаў і брыгадзіраў у выніках сваёй работы, зьяўляецца магутным вагаром для мабілізацыі мільённых мас на пасьпяховую ўборку сацыялістычнага ўраджаю.

Новы парадак разьмеркаваньня ўраджаю, у адрозьненьне ад мінулага году, прадугледжвае выдачу калгасьнікам поўнасьцю ня толькі грашовай долі даходаў, якая ім належыць па працадзёх, але і збожжа і фуражу. Гэта значыць, што абмежаваньне выдачы натуральнай часткі даходаў на рукі калгасьніку, якое практыкавалася ў мінулым годзе, зараз адмяняецца. Яно дапускаецца толькі ў адносінах да адміністрацыйна-кіраўнічага складу калгасу. Гэтыя асобы, незалежна ад колькасьці выпрацаваных імі працадзён, ня могуць атрымаць больш збожжа, чым у сярэднім атрымлівае калгасьнік, які працуе у настаянай брыгадзе і добрасумленна выконвае свае заданьні.

Кожны калгас зараз павінен рашуча адмовіцца ад практыкі мінулага году, калі разьмеркаваньне грашовай часткі даходаў адкладвалася на канец году, і арганізаваць сыстэматычнае адлічэньне калгасьнікаў. Аспоўная частка грошай, атрыманая за зданую (праданую) прадукцыю, павінна выдавацца калгасьніку ў парадку авансу бяз лішніх затрыманьняў.

Вялікую ролю набывае парадак выдачы натуральных авансаў. Паводле пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, «неабходна ўжо ў годзе абмалоту зрабіць выдачу калгасьнікам авансаў у лік натуральнай часткі даходу ў разьмеры 10-15 проц. фактычна абмалочанага збожжа, з тым, каб разьмеркаваньне гэтага авансу, таксама, як і разьмеркаваньне ўсяго даходу, рабілася выключна па працадзёх».

Аспоўная задача разьмеркаваньня калгасных даходаў — на справе забясьпечыць павышэньне матар'яльнай зацікаўленасьці калгасьніка ў выніках сваёй работы. Кожны калгасьнік пасьля разьмеркаваньня даходаў павінен па справе пераканацца ў перавазе калгаснай працы перад працай аднаасобніка як на аснове росту аграмаджанай гаспадаркі так і паляпшэньня свайго матар'яльнага станоўішча. Бо селянін «прышоў у калгас для таго, каб атрымаць тут усе выгады буйнай сацыялістычнай гаспадаркі. Калі ён гэтай выгады не атрымае, калі ён убачыць, што аднаасобнік атрымлівае і зарабляе больш, ён будзе адчуваць сябе дрэнна, ён будзе шукаць «выхаду ў выхадзе». Гэта трэба зразумець і цьвёрда запамятаць» (Каганові́ч).

Гэта значыць, што ў гэтым годзе ні ў якім разе нельга дапускаць паўтарэньня памылак мінулага году ў сэнсе ігнараваньня асабістых патрэб калгасьніка, калі дзе-ні-дзе забывалі забясьпечыць кармамі жывёлу, якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні калгасьнікаў, урэзвалі выдачу на рукі натуральных даходаў і г. д.

Зусім зразумела, што пры разьмеркаваньні даходаў нельга забываць і пра насеньня і кармовыя фонды, якія павінны ствараца ў часе самога працэсу разьмеркаваньня. Усю работу па разьмеркаваньні даходаў трэба самым шчыльным чынам увязваць з выкананьнем пляну дзяржаўных збожжазагатовак, што зьяўляецца першачарговай задачай кожнага калгасу. Разьмеркаваньне даходаў у калгасе фактычна павінна пачынацца з выкананьня яго абавязкаў перад дзяржавай, на зямлі якой ён працуе і пры дапамозе якой умацоўвае і пашырае калгасную вытворчасьць.

Няма сумненьня ў тым, што пры разьмеркаваньні даходаў рэшткі кулацтва будуць рабіць спробы, каб узьдзейнічаць на адсталую частку калгасьнікаў, штурхнуць іх на няправільны шлях процістаўленьня інтарэсаў калгасу інтарэсам дзяржавы. Апіраючыся на калгасны актыў, трэба даць руйнуючы адпор кулацтву і яго агентуры — правым і «левым» апартуністам і дабіцца выкананьня ў тэрмін усіх загатоўчых плянаў. Пасьля выкананьня абавязкаў перад дзяржавай калгас абавязан бяз ліпняга зацягваньня выдаць калгасьнікам усю астатнюю частку харчоў і фуражу, якая ім належыць.

Павышэньне матар'яльнай зацікаўленасьці кожнага калгасьніка ня можа быць вырашана без выкараненьня ўраўнілаўкі ў аплаце за калгасную працу. ЦК і СНК у сваёй пастанове падкрэсьліваюць, каб «калгасы, якія лепш пасеялі, лепш убралі і акуратна выканалі вызначаны для іх план дзяржаўных загатовак, мелі адпаведна ў сваім распараджэньні для асабістых патрэб большую колькасьць збожжа». Трэба на справе стварыць такія ўмовы, каб калгасьнік, які больш і лепш будзе працаваць, атрымаў і большую частку натуральных і грашовых даходаў адпаведна працадням.

Весткі, якія атрыманы намі за апошнія дні, сыгналізуюць аб тым, што ў радзе раёнаў БССР гэта дырэктыва груба парушаецца. Пры выдачы авансаў, напрыклад, ужываецца мэтад дробна-буржуазнай ураўнілаўкі—авансы выдаюцца па двароx, едакох і каровах. Напрыклад, у Пухавіцкім раёне ў калгасе **«Ленінская Слабада»** калгасьнікам раздалі па 40 пудоў сена, незалежна ад таго, хто і як з іх працаваў. У калгасе **«Чырвоны партызан»**, Капыльскага раёну, кожнаму калгасьніку, які мае карову, выдалі па 100 пудоў сена. Такія факты мелі месца ў калгасах Дзяржынскага раёну.

Мэтад кулацкай ураўнілаўкі пры выдачы авансаў, зразумела, ня мог не адбіцца на тэмпах работы па сенажацях. Пасьля такога «разьмеркаваньня» ў гэтых калгасах заўважваецца паслабленьне працоўнай дысцыпліны і нявоўны выхад калгасьнікаў на работу. Такія скажэньні маглі мець месца толькі таму, што важнейшыя пастановы партыі і ўраду, якія зьяўляюцца магутным вагаром для пасьпяховага разгортваньня ўборкі, у гэтых раёнах ня былі даведзены да шырокіх мас калгасьнікаў.

Ва ўмовах БССР стварэньне кармовай базы для сацыялістычнай жывёлагадоўлі, забясьпячэньне кармамі жывёлы саўгасаў, калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў зьяўляецца жыцьцёва-неабходнай задачай.

ЦК КП(б)Б у сваіх пастанорах ня раз зьвяртаў увагу партыйных і савецкіх арганізацый на важнасьць гэтай гаспадарча-палітычнай задачы. Але ход сенаўборкі па БССР (29,4 проц. выкананьня рэспубліканскага пляну на 20 ліпеня) сьведчыць, што ў радзе раёнаў імпануюць пытаньне стварэньня кармовай базы. Ня гледзячы на тое, што тэрміны сенаўборкі ўжо прайшлі, значная частка раёнаў не ўбралі нават і 20 проц. сваіх сенажацяй.

Такое становішча далей працягвацца ня можа. Нельга дапусьціць ні ў якім разе паўтарэньня практыкі мінулага году, калі ў паасобных саўгасах і калгасах з прычыны зацяжкі сенаўборкі, дрэннай арганізацыі працы, тысячы гэктараў сенажацяй засталіся няўбранымі.

Раённыя арганізацыі павінны кіраваць сенаўборкай ня толькі наогул, але і ў кожным сельсавеце, у кожным саўгасе і калгасе ў паасобку адпаведна асаблівасьцям кожнай гаспадаркі. Гэта можа быць дасягнута толькі на аснове апэрацыйнага ўліку, на аснове жывой сувязі паміж раённымі зямельна-калгаснымі арганізацыямі і калгаснай вытворчасьцю.

Зараз, калі ў БССР пачалося масавае жніво, трэба так расставіць сілы ў калгасах, каб разам з уборкай азімых і яравых максымальна фарсаваць уборку сенажацяй.

Толькі пры мабілізацыі актыўнасьці ўсёй калгаснай масы, пры скарыстаньні гаспадарчага вопыту лепшых калгасьнікаў-актывістаў і брыгадзіраў, на аснове пастаноў партыі і ўраду аб разьмеркаваньні ўраджаю і калгасным гандлі, — мы здолеем у найкарацейшы тэрмін і з мінімальнымі стратамі ўбраць сацыялістычны ўраджай.

СКАРЫСТАНЬНЕМ ГАСПАДАРЧАГА ВОПЫТУ брыгадзіраў і лепшых калгасьнікаў-актывістаў— ПАТРОІМ ТЭМПЫ НА СЕНАЖАЦЯХ

За пераходны сьцяг

УВАРАВІЧЫ. Пасьпяхова правёўшы веснавую сяўбу і поліва, калгас **«Чырвоны шлях»** па-бальшавіцку змагаецца за правядзеньне ўборачнай.

Пачаўшы сенаўборку 3 ліпеня (з некаторым спазьненьнем), паляводчыя брыгады калгасу дабіліся выкананьня пляну да 17 ліпеня на 60 проц. Па калгасе скошана сенажацяй 298 га, высушана і засьцёртавана 200 га.

Упередзе ўсіх ідзе брыгада № 3 т. **Вераб'ёва**. Яна скасіла 62 га (62 проц. свайго пляну). Касцы трэцяй брыгады ўвесь час перавыконваюць нормы выпрацоўкі. Замест 0,33 га, яны скошваюць па 0,45 га. Усе жанчыны брыгады працуюць на сушцы і ўборцы сена.

Калгасьніцы **Іваньчыкава і Багданава**, маючы па 63 гады, сыстэматычна выходзяць на працу, хаця яны і не прадугледжваюцца нарадам брыгадзіра. Паміж брыгадамі разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Уборка па калгасе будзе скончана 25 ліпеня. Калгас „Чырвоны шлях" з 19 ліпеня прыступіў да ўборкі азімых.

Сенаўборка праходзіць пад лёзунгам барацьбы за пераходны раённы сьцяг, які зараз знаходзіцца ў суседнім калгасе імя Будзённага. **Гаўрыковіч.**

Ударніка акружыць пашанай

ЖЛОБІН. Ужо надышла ўборка жыта і яравых, а саўгас **«Хальч»** яшчэ ня скончыў пават і ўборкі сенажацяй. На 20 ліпеня з 500 гэктараў сенажаці ўбрана 170. Прычыны такіх чарапаных тэмпаў хаваюцца ў тым, што партыйная ячэйка, рабачком і дырэкцыя не змагаюцца за ўкараненьне 6 гістарычных умоў тав. Сталіна ў саўгасную вытворчасьць.

Дырэкцыя даўно ведала, што для ўборкі сенажацяй у 20-цідзённы тэрмін патрэбна мець 120 касцоў. Але палец аб палец ня ўдарыла для таго, каб своячасова арганізаваць набор рабочай сілы. На касьбе працуе 2 брыгады з 20 чалавек. Касарка стаіць неадрамантаваная.

Але і наяўная рабочая сіла скарыстоўваецца няправільна. Сенажаці не замацаваны за пэўнымі брыгадамі, таксама, як і інвэнтар. Частка сэзонных рабочых, якія заняты па акучваньні бульбы або сенаборцы, часта пасылаюцца на разьязныя работы, замест таго, каб захаваць пастаянныя брыгады на ўборцы.

Паляводчы цэх мае выстарчальны кіраўнічы апарат (загадчык цэху, 2 паляводы і табэльшчык). Ня гледзячы на гэта, зьдзельшчына на ўборцы, за выключэньнем касьбы, не арганізавана. Жанчыны не разьбіты па брыгадах і працуюць падзённа. Адсюль, як вынік, і слабая прадукцыйнасьць працы. З прычыны безадказных адносін да работы паляводаў і некаторых брыгадзіраў ёсьць факты пакіданьня сена пад даждком. Так 17 ліпеня работа па ўборцы сена была закончана як заўсёды ў 19 гадз. Частка сена засталася ня складзенай у копы і потым гніла пад даждком. Гэта ў той час, калі можна было затрымаўшы рабочых яшчэ на гадзіну закончыць уборку ўсяго сена.

Аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня ў саўгасе толькі гавораць, але нічога канкрэтнага ня робяць, каб узьняць работу сталоўкі. Ня гледзячы на значныя магчымасьці для арганізацыі харчаваньня з розных прадуктаў, рабочых ад самай вясны кормяць лапшовым супам ды гарохам. Абеды гатуюцца зусім дрэнна. Мяса ў супе ніколі не даварваецца. Загадчык сталовай т. Рабкін ня цікавіцца паляпшэньнем грамадзкага харчаваньня.

— Што даюць, тое і еш, — вось яго дэвіз.

Насьценгазэта саўгасу ўзьняла пытаньне аб неабходнасьці дастаўкі абедаў на сенажаць. Загадчык паляводчага цэху **Жураўлёў** лічыць гэта «немагчымым» і рабочых ходзяць за некалькі кілёмэтраў на абед у сталовую, трацячы на гэта шмат сіл і часу.

Партыйна - масавая, палітыка - выхаваўчая работа ў саўгасе зажынута. Асаблівую бязьдзейнасьць праяўляе рабачком. Студэнты - практыканты, зоатэхнікі і фэльчары не скарыстоўваюцца для гэтай работы. Вызначаныя ў часе весназой слубы прэміі лепшым ударнікам яшчэ і зараз не разданы. Нічога ня зроблена і для выяўленьня і прэміяваньня ўдарнікаў сенаўборкі. Такім чынам дырэкцыя і рабачком зрываюць ударніцкі рух.

Дырэкцыя і рабачком, замест мабілізацыі актыўнасьці рабочых, ідуць па шляху найменшага супраціўленьня і разбазарваньня кармовых фондаў. 120 га няўбранай сенажаці імі ўжо зданы аднаасобнікам «з часткі».

Лепшыя ўдарнікі саўгасу выступілі з прапановай аб увядзеньні на час сенаўборкі 10-гадзіннага рабочага дня. Дырэкцыя і грамадзкія арганізацыі саўгасу павінны падтрымаць гэту ініцыятыву і разам з тым паляпшыць грамадзкае харчаваньне саўгасу і забясьпячэньне ўдарнікаў.

Ударніка акружыць пашанай і любоўю! Зараз-жа наладзіць улік і аплату ад. колькасьці і якасьці працы. Толькі пры гэтых умовах саўгас здолее скончыць сенаўборку і разгарнуць уборку збожжавых.

Надтачэў Д.,
Еўзрэзаў Ф.

Кулацкая ўраўнілаўка пры разьмеркаваньні авансаў зрывае сенаўборку

ДЗЯРЖЫНСК. Перадавыя калгасы Дзяржынскага раёну (Койданаўшчына) з посьпехам скончылі сенаўборку. Камуна **«Чырвоны сьцяг»** ужо пераключылася на ўборку збожжавых. 5 калгасаў **Бараўскага** сельсавету ўжо скасілі і зьвезьлі ўбранае сена. **Навасёлкаўскі** сельсавет убраў сенажаць на 61,4 проц., **Негарэльскі** — на 60 проц. І усё-ж па раёне ўборка сенажацяй разгортваецца чездавальняюча. На 15 ліпеня ўбрана толькі 38,4 проц. сенажацяй.

У большасьці сельсаветаў сенаўборка праходзіць самацёкам. У выніку Сталінскі сельсавет убраў 14 проц. сенажацяй, Возерскі—16 проц., Парэйкаўскі—22 проц.

У калгасах гэтых сельсаветаў за апошні час частка калгасьнікаў ня выходзіць на работу. Тлумачыцца гэта кулацкай ураўнілаўкай пры разьмеркаваньні авансаў сена. Напрыклад, у калгасе **імя Леніна**, Станькаўскага сельсавету, пры разьмеркаваньні сена прагульшчык **Дзюран** Віктар, які выпрацаваў усяго 39 дзён, атрымаў 53 пуды сена, належыла-ж яму 11 пудоў і 28 фунтаў. **Пуцявіцкі** Алесь выпрацаваў 43 дні, атрымаў 52 пуд.—належыла 13 пуд. 13 фунт.

Затое ўдарнікі атрымалі сена менш чым ім належыла. Напрыклад, **Шылінская**, якая выпрацавала 222 працадні, атрымала на 10 пудоў 25 фунтаў сена менш, чым ёй належыла. Калгасьнік **Калечыц** выпрацаваў 260 працадзён, недаатрымаў 10 пудоў 28 фунтаў сена.

Райкалгассаюз пасьля сяўбы адначывае на лаўрах. Сенаўборка, як аспоўнае мерапрыемства па стварэньні моцнай кармовай базы для разьвіцьця жывёлагадоўлі, яшчэ ня стала ў цэнтры работы райкалгассаюзу і райземаддзелу. (БЕЛТА).

РАЗЬБІЎКА ГІГАНТОСАЎ
(Калгас «Праўда» Лезьнян. р.).

Змагаюцца за працадзень

ЛЕЗНА. (Наш. кар). Калгасы **Кабыльніцкага** сельсавету суцэльнай калектывізацыі канчаюць сенаўборку. На 19 ліпеня плян касьбы выкананы на 85 проц., праз 3-4 дні касьба скончыцца.

Як Кабыльніцкі сельсавет дабіўся гэтых посьпехаў?

Першая і аспоўная ўмова посьпеху — правільная расстаноўка партыйных сіл па калгасах і брыгадах, правільная арганізацыя сіл унутры калгаснай брыгады.

Кабыльніцкая парт'ячэйка яшчэ перад пасеўнай кампаніяй кожнага члена і кандыдата партыі прымацавала да таго ці іншага калгасу. Няма ніводнай калгаснай брыгады, у якой ня было-б партыйца, або камсамольца. Правільна расставіўшы сілы, бюро ячэйкі сыстаматычна правярала работу кожнага асобнага таварыша.

Сельсавет з посьпехам правёў пасеўную, справіўся з сенаўборкай і зараз падрыхтаваўся да ўборкі жыта, якая распачынаецца праз пяць дзён.

Вопыт калгасаў Кабыльніцкага сельсавету паказвае, што найлепшай формай арганізацыі працы зьяўляецца разьбіўка сіл брыгады на дробныя вытворчыя групы.

У групах падбіраюцца людзі больш-менш аднолькавай сілы, бліжэйшыя адзін да аднаго па тэрыторыі, людзі, якія ўжо спрацаваліся.

Вось, напрыклад, у калгасе **«Авангард»** група касцоў з 3 чалавек—т. т. Сяргеенкі Васіля, Афанасенкі Мікіты, Сяргеенкі Цімоха сыстэматычна перавыконвае нормы. Яны замест 0,33 гэкт. па чалавека, скошвалі ня менш 0,40 гэкт. і пярэдка 0,52-0,56 гэкт. у дзень. Гэта—ударныя нормы.

У калгасе **«Чырвоны Кастрычнік»** група касцоў — т.т. Зянькоў Захар, Рахацаў Васіль, Рудакоў Сьцяпан за адзін дзень скасілі 1,80 гэкт., г. зн. па 0,60 гэкт. па чалавека замест 0,33 гэкт.

Ударныя групы — ініцыятары сацыялістычнага спаборніцтва. Па іх раўняюцца астатнія, іх тэмпы становяцца тэмпамі ўсёй брыгады, усяго калгасу.

Калі летась жанчыны зусім слаба выходзілі на работу, дык сёлета яны выходзяць рэгулярна, штодзенна. За работу змагаюцца, работы дабіваюцца. Працадзень сёлета стаў рэальнай каштоўнасьцю, за яго б'юцца.

Гэтыя дасягненьні—выцік работы парт'ячэйкі. Увесь каштоўны вопыт сяўбы і сенаўборкі патрэбна перанесьці на жніво, церабленьне і апрацоўку ільну, на ўсе асеньнія сельска-гаспадарчыя работы.

Рэалізацыя пазыкі „4 заключнага"

ВОПЫТ КОЙДАНАЎСКАЙ РАЙАШЧАДКАСЫ ПАШЫРЫЦЬ НА ЎСЕ АШЧАДКАСЫ БССР

Добры пачын

Да адкрыцьця савецкага рынку партыйнымі, савецкімі і прафсаюзнымі арганізацыямі Койданаўшчыны была разгорнута шырокая падрыхтоўчая работа. Фарсаванымі тэмпамі на працягу некалькіх дзён рынак быў абсталяваны. 19 чэрвеня адбыўся першы арганізаваны выезд працоўных Койданаўшчыны на савецкі рынак.

Гэты момант скарыстала і раённая ашчадкаса. У дзень адкрыцьця савецкага рынку праведзена была масавая праверка выйгрышаў па ўсіх тыражох пазык. Тут-жа, на месцы, пагашаліся аблігацыі, па якія паў выйгрыш. У гэты дзень выплачан выйгрыш 16 чалавекам на суму 420 руб. З іх трох рабочым, 9 калгасьнікам і 4 аднаасобнікам. Акрамя гэтага, была наладжана кансультацыя па пытаньнях пазыкі, якой ахоплена 211 чалавек.

Гэты мэтад койданаўская райашчадкаса праводзіць і надалей. Кожны калгасны рынак абслугоўваецца спэцыяльным дзяжурным сталом райашчадкасы. Да сёнешняга дня аплочана 56 выйгрышаў на суму 960 руб.

Такі мэтад работы ўзьняў сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў Койданаўшчыны вялікую зацікаўленасьць да пазыкі. Кожны, хто выяжджае на савецкі рынак, лічыць абавязковым узяць з сабою аблігацыі пазыкі, каб праверыць іх і атрымаць адпаведныя даведкі.

Мэтад работы райашчадкасы Койданаўшчыны заслугоўвае ўвагі ўсіх ашчадкас БССР.

Болдзісаў.



Тав. УСЬЦІНАЎ
рабочы ўдарнік жэлятыннага цэху гарбарні „Бальшавік" падпісаўся на пазыку «4 зьвяршаньня на 118 проц. месячнай зарплаты

Камсод пры калгасцэнтры на паперы

Рэалізацыя пазыкі «4 заключнага» па сыстэме Калгасцэнтру БССР праходзіць зусім нездавальняюча. На 15 ліпеня кантрольнае заданьне выканана толькі на 53 проц. Адсутнасьць жывога апэрацыйнага кіраўніцтва раёнамі — галоўная прычына адставаньня. Цэнтральная камісія пры Калгасцэнтры існуе толькі на паперы. Яна зусім ня ведае, што робіцца на мясцох. Між тым, рад раёнаў па калгаснай сыстэме слаба рэалізуюць пазыку. Так, **Хойніцкі** раён выканаў заданьне на 5,4 проц., **Прапойскі** — на 4,3 проц., **Уваразіцкі** — на 9 проц. Да гэтага часу камсод Калгасцэнтру заслухаў на сваім пасяджэньні толькі 2 раёны.

Значным тормазам у рэалізацыі пазыкі зьяўляецца затрыманьне выдачы аблігацый пазыкі «3-га рашаючага». Камісія садзейнасьці пры Калгасцэнтры зусім не займаецца гэтай справай.

Рад калгасаў паказалі сапраўды бальшавіцкія ўзоры рэалізацыі пазыкі. Так, калгас «Гігант», Крупскага раёну, на аснове шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва дабіўся значнага перавыкананьня кантрольнага заданьня. Але гэты вопыт не перанесен у адстаючыя калгасы. Камісія ні разу не выяжджала ў адстаючыя раёны. Аргмасавы аддзел Калгасцэнтру таксама стаіць у баку ад гэтай важнейшай гаспадарча - палітычнай кампаніі.

Значную долю віны за марудныасьць рэалізацыі пазыкі трэба ўскласьці на кіраўніцтва ашчадкас БССР. Прадстаўнікі ад кіраўніцтва тав. **Бутырскі** (ён -жа загадчык фондавага аддзелу) і тав. **Палес** не сыгналізавалі своячасова перад адпаведнымі арганізацыямі аб бязьдзейнасьці камсоду пры Калгасцэнтры.

Брыгада «Зьвязды»—Прохараў, Железьняк, Ваокавіцкі, Брэгер.

Самацёк і бязьдзейнасьць у рабоце менгаркамсоду

Ня так даўно за бязьдзейнасьць у справе рэалізацыі пазыкі «4-га завяршальнага» гарком КП(б)Б і прэзыдыум гарсавету распусьцілі Менскі гаркамсод і зьнялі кіраўніцтва гарадзкой касы ашчадкасьці. Але новае кіраўніцтва таксама не зрабіла належнага пералому. Канкрэтнасьці, апэрацыйнасьці ў рабоце дагэтуль яшчэ няма. Самацёк і бязьдзейнасьць гаркамсоду працягваецца. Пасяджэньні з прычыны няяўкі асобных членаў камсоду сыстэматычна зрываюцца. Член камсоду — прадстаўнік гарпрафсавету тав. **Кудраеў** не зьявіўся ні на адно пасяджэньне. Пастановы камісіі не даводзяцца да нізавых зьвеньняў і трацяць усякае значэньне, не гаворачы ўжо аб праверцы іх выкананьня.

— Для чаго нам пастановы і пратаколы, калі ёсьць тэлефон, — так разважае старшыня камсоду тав. Каранеўскі.

Гаркамсод і дагэтуль ня мае пэўнага малюнку, што робіцца на прадпрыемствах Менску. Улік нізавых камсодаў адсутнічае.

Яркім фактам бязьдзейнасьці зьяўляецца адсутнасьць усякага ўдзелу ў пяцідзеньніку самаправеркі, афармленьня падпісі, які абвешчан рэдакцыяй газэты «Рабочий» і Менгаркомам КП(б)Б. Пяцідзеньнік скончыўся, а гаркамсод і ашчадкаса № 16 нічога не зрабілі. Т. т. **Жалезны, Ксваль, Дабрынін, Кейліна, Ракітус, Бакрашэўскі** і **Акінчава**, вылучаныя адказнымі за пяцідзеньнік, не прымацаваліся да паасобных заводаў, каб правесьці там адпаведную работу. Першы узнос паступае нездавальняюча. На 20 ліпеня з агульнай сумы 400 тыс. руб. унесена толькі 154 тыс. Улік паступленьня ўзносаў наладжан зусім дрэнна.

Тэрмін афармленьня падпісі скончыўся 15 ліпеня, а на 20 ліпеня афармлена толькі каля 75-80 проц. Паасобныя прадпрыемствы і калектывы значна адстаюць у афармленьні падпісі. Так, завод імя Варашылава замест 152.900 руб., аформіў на 143.205 руб., фабрыка «Кастрычнік» — на 73.165 руб., замест 76.700 руб., «Камунар» — на 104.400 руб., замест 111.400 руб., паштова-тэлеграфная кантора — на 12.600 руб., замест 22.940 руб., фабрыка «8 сакавіка» — на 50 тысяч руб. замест 61.200 руб.

Брыгада «Зьвязды»: ШУМІНСКІ, КЛІНСОН, БЕРАС, БЕНШТЭЙН.

Калгасьнікі і аднаасобнікі пачалі датэрмінова ўносіць сельска-гаспадарчы падатак

У мэтах пасьпяховага завяршэньня пляну чацьвертага заключнага году пяцігодкі, на аснове шырокай растлумачальна-масавай работы, рад перадавых калгасаў, калгасьнікаў і працоўных сялян—аднаасобнікаў БССР датэрмінова пачалі ўносіць новы с.-г. падатак.

***

Радкаўскі сельсавет (Любаньскага раёну) першым у раёне распачаў работу ў гэтым напрамку. На 12 ліпеня па сельсавеце паступіла 2.500 руб.

Першымі поўнасьцю ўнесьлі с.-г. падатак калгасьнікі ЛАГУН ЗЬМІТРО, МІХАЛЕНЯ ДЗЯМ'ЯН і аднаасобнікі: ШУЛЯКОЎСКІ ЦЭРАХ, БАРЫСЕВІЧ МІХАСЬ, ЛАЎРЭНЯ ЯКУБ, КАЗАКЕВІЧ МІКОЛА, СЯЎРУК ФАТЫНЯ.

ЯРМОЛАЎ.

***

КАЛГАС «НОВАЕ ЛЯДЦО», Навасёлкаўскага сельсавету (Пухавіцкі раён) гэтымі днямі здаў 800 руб. падатку і выклікаў калгасы «НОВЫ ЗАГАЙ», «БЯЗБОЖНІК», ІМЯ МІХАЙЛАВА, «ЧЫРВОНЫ БОР», «ГАРАДОК» гэтага-ж сельсавету.

ДРОЗ"

Прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці Наркамцяжпраму, Наркамлёгпраму, Наркамлеспраму і Наркамснабу за чэрвень і першае паўгодзьдзе 1932 году

ГРУПЫ ГАЛІН	Абсалют. даныя ў цэнах 1926-27 г. (у тысячах руб.).		Прадукцыя за чэрв. 1932 г. у проц.		Прадукцыя за 6 мес. 1932 г. у проц. да адпаведнага пэрыяду 1931 г.
	За чэрв. 1932 г.	За 6 мес. 1932 г.	Да маю 1932 г.	Да чэрв. 1931 г.	
Група „А"	13637,3	74334,2	108,1	108,5	122,8
Група „Б"	28550,7	183191,4	99,9	120,4	133
Уся прамысловасьць НКЦяжпраму, НКЛёгпраму, НКЛеспраму, НКСнабу	42188	257515,6	102,4	116,4	129,9
У тым ліку:					
НКЦяжпраму	3932,3	21385,2	99	98,1	122,4
НКЛёгпраму	27672	164469	102,1	128,3	132
НКЛеспраму	6243	32390	121,1	118,7	123,4
НКСнабу	4340,7	39271,4	87,3	79,6	130,9

Кіраўніцтва народна-гаспадарчага ўліку БССР.

Пастанова Сакратарыяту Менгаркому КП(б)Б і Прэзыдыуму Мен. ГарКК ад 22|VII-32 г.

За адмаўленьне без усякіх падстаў тав. Грыба (з-д «Камунар») ад выезду ў сельсавет на адказную партработу—выключыць яго з радоў партыі.

Пастанову гэтую апублікаваць у друку.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б **Шпэктараў.**

За старшыню Мен. ГарКК—**Хадасевіч.**

Арганізацыі працы і культурна-бытавому абслугоўваньню дарожнікаў—максымум увагі

Кіраўніцтва 4 маршрутнага дарожнага вучастку лічыць, што ўсе магчымасьці для скарачэньня будаўніцтва дарогі ёсьць. А між тым сучасныя тэмпы работ не забясьпечваюць выкананьня гэтай задачы.

У чым прычыны?

Іх многа. Не хапае рабочай сілы, не хапае фурманак. Адміністрацыйна-тэхнічны персанал вучастку спадзяваўся толькі па абавязковы працоўны ўдзел насельніцтва і амаль нічога не рабіў, каб арганізавана набраць рабочую сілу.

У многіх выпадках дзесятнікі, тэхнікі, прарабы, выходзячы на лінію варожаць:

— Прыедуць ці ня прыедуць сёньня фурманкі?

— Прыдуць, ці ня прыдуць пешыя рабочыя?

Так чакаюць гадзінамі.

А ў гэты час мастаўпічыкі прастойваюць, бо не падвезена цэгла ці пясок; рассыпшчыкі прастойваюць, бо не падвезен шчэбень: каткі прастойваюць, бо ня зроблена расклінцоўка...

Складаецца «канвэер» прастояў.

Рабочыя і фурманкі выходзяць на лінію позна. Прадукцыйнасьць працы нізкая. Напрыклад, па вучастку тэхніка **Мукніцкага:** па падвозцы камня норма выконваецца толькі на 80 проц.; пяску—60 проц., шчэбню—20 проц. Наогул па вучастку дзенныя заданьні выконваюцца прыблізна на 50 проц.

Галоўная прычына слабага ходу работ крыецца ў адсутнасьці палітычна-масавай работы, бязьдзейнасьці партыйных ячэек і рабкомаў, слабым адміністрацыйна-тэхнічным кіраўніцтве.

Ня гледзячы на тое, што парт'ячэйкі арганізаваны, але арганізаваны яны фармальна і працы ніякай не вядуць. Спасылаюцца на тое, што яны раскіданы, сабрацца ня могуць. Тое самае і з камсамольцамі.

Рабкомы ня існуюць. У іх ёсьць старшыні, якія бездапаможна скардзяцца:

— Што я зраблю адзін, мне не дапамагаюць,—заяўляе **Ткачэнка,** старшыня рабкому вучастку тэхніка Мухніцкага.

— Не магу справіцца адзін,—уторыць яму **Башкіроў,** старшыня рабкому вучастку тэхніка Расалая.

А старшыня рабкому вучастку тэхніка Мірончыка, **Міневіч,** зусім пакінуў працу і невядома дзе дзеўся.

Справядліва рабочыя крыўдзяцца:

— Рабкомы ў нас ня бываюць, з намі не гавораць, аб нас не клапоцяцца. Балючых, ня выраванных пытаньняў шмат...

— Чаму абмотак не даюць?

— Чаму малаткі лёгкай вагі?

— Чаму вады не гатуюць?

Сотні «чаму» застаюцца без адказу. Няма асобы, якая-б клапацілася аб бытавых умовах рабочых. У памяшканьні антысанітарыя: падлогі ня мыюцца, ёсьць клапы і блохі, няма стала, няма газэт.

Культмасавая праца адсутнічае.

На ўсім вучастку рабочыя амаль ня бачаць газэт. Насьцендгазэт зусім ня было да апошняга часу. Толькі зараз арганізован выпуск 3-4 штодзенак.

З ударнікамі работа не вядзецца. Вопыт прыкладных ударнікаў і брыгад (напрыклад, у дзесятніка **Цясьлёнка** і іншых), не падхопліваецца і не пераносіцца на другія вучасткі. Няма насьцендруку і слаба працуе шматтыражка.

Дрэнна працуе каапэрацыя. Рабочыя з вучастку Крукова за 13 клм. прыходзілі па некалькі раз за прадуктамі і ніяк не маглі атрымаць. Крама часта закрыта, нават у выхадныя дні рабочых.

— Прадукты—на лінію, да месца работы,—такі павінен быць лёзунг каапэрацыі. Каапэрацыя замяніла самазагатоўкі, тавараабменам. Прамтавары, якія прыпачаліся для рабочых (боты, бацінкі, махорка і г. д.), пускаюцца на «самазагатоўкі».

— Інакш нічога не загатовім,—заяўляюць гора-каапэратары з даррабкопу.

Не арганізавана, як належыць, грамадзкае харчаваньне.

— Рэдкія выпадкі, калі абеды прывозяць своячасова,—так заяўляюць рабочыя. Часта-ж абед прывозяць а... 7 гадзіне ўвечары.

За ўсе гэтыя злачынствы ні адзін каапэратар не пакараны.

У той час, калі па 7 і 52 клм. абеды прадаюцца па 50 кап.—на 72 клм. вызначылі... 1 руб. за абед горшай якасьці, чым у іншых пунктах. І гэтага ім мала. Старшыня каапэрацыі **Варанько** піша вучастку: «Вы павінны плаціць нам па 8 руб. за дровы і 6 руб. за ваду ў дзень. У выпадку няўплаты, я буду адносіць за кошт абедаў».

Гатуецца 100 абедаў. Такім чынам прыпадае па 6 кап. за ваду на адзін абед, па 8 кап. за дровы. Гэта называецца «гаспадарчы разрахунак». Тут павінен ўмяшацца пракурор і зрабіць свае вывады.

Ад таго, як будуць ліквідаваны ўсе гэтыя агідныя факты, будзе залежыць посьпех выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва па 4 вучастку.

А. Мікуцкі.

Прастоі мэханізмаў

БАРЫСАЎ. (Наш кар.).

Выкананьне дарфінпляну па вучастку тэхніка **Дарохіна** стаіць надзвычай дрэнна. На баласьціроўцы плян выкапан на 60 проц., загатоўцы шчэбню—85 проц., брукаваньні бардзюр — 45 проц. і рассыпцы шчэбню—на 30 проц. І гэта ў той час, калі вучастак поўнасьцю забясьпечан рабсілай.

Асобныя кіраўнікі тлумачаць слабое выкананьне пляну тым, што вясной ня былі падрыхтаваны карыты. Сапраўдная-ж прычына ў тым, што адміністрацыя не забясьпечыла правільную расстаноўку і выкарыстаньне рабсілы.

Сэктар мэханізацыі вучастку да апошняга часу ніяк ня можа наладзіць бесьперабойную работу машын. 5-та ліпеня камнядрабілкі на 121 кілёмэтры прастаялі цэлы дзень з-за адсутнасьці гаручага, якое ня было падвезена па віне сэктару мэханізацыі.

З-за дрэннага кіраўніцтва сэктару нядаўна ўстаноўленыя кампядрабілкі на 93 кілёмэтры працуюць зусім дрэнна. Адсутнічае тэхнагляд. Латок пастаўлен пад столяй, што значна перашкаджае рабочым перавозіць шчэбень. Пляцоўка, куды кідаюць камень, агароджана толькі адной дошкай.

Факты дрэннай работы мэханізмаў, адсутнасьці тэхнагляду ёсьць ва ўсіх прарабскіх вучастках.

Н. Нэйдлін.

За 1,5 млн. тон добраякаснага торфу

ТАРФЯНІКІ, АД ВАС ЧАКАЕ КРАІНА ЛІКВІДАЦЫІ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦІ Ў ТОРФЕ!

Здабыча торфу

(у тонах і процантах)

заводамі Белторфаб'яднаньня

17 ліпеня	18 ліпеня	19 ліпеня	20 ліпеня
2515	3077	2107	1936
30,0	36,7	25,0	23,1

Заводамі Наркамлёгпраму

15 ліпеня	16 ліпеня	17 ліпеня	18 ліпеня
576	817	ДЗЕНЬ АДПАЧЫНКУ	635
37,6	53,4		41,5

Заводамі мясцовай прамысловасьці

15 ліпеня	16 ліпеня	17 ліпеня	18 ліпеня	19 ліпеня
518	361	398	602	312
47,7	33,2	39,0	59,0	31,2

Тав. **ПАУЛАЎ**
ударнік Цялянскіх торфараспрацовак

***

Чацьвертая пяцідневка ліпеня дала рэзкае зьніжэньне тэмпаў торфаздабычы. Як паказвае зводка, ні адна з сыстэм, якія здабываюць торф, на працягу ўсіх 5 дзён не дасягнула поўнай выпрацоўкі сутачнага заданьня. Асабліва нізкія паказальнікі атрыманы па заводах Белторфаб'яднаньня. Асінторф за 20 ліпеня сваё сутачнае заданьне выканаў на 11,9 проц., „Бальшавік"—на 28,5 проц., „Шлях сацыялізму"—24,5 проц., „Чырвоная Беларусь"—на 15,4 проц. Нават завод „Закрашынскі мох", які сыстэматычна перавыконваў свае пляны, 20 ліпеня даў толькі 97,9 проц.

Ураўнілаўка і абязьлічка—прычыны слабой работы

Торфзавод імя Даўмана (Сіроцінскі раён) на працягу ўсяго сэзону ня выходзіць з паласы прарыву. На 18 ліпеня калядцарны плян выкапан толькі на 56,3 проц., гадавы — 43,9 проц.

Вярбоўка рабочай сілы ў часе падрыхтоўкі да сэзону праходзіць самацёкам. Замест практычнай работы па арганізаваным наборы рабочых, трыкутнік заводу займаўся «очковтирательством»; рапартаваў райкому КП(б)Б і РВК, што завод вышаў пераможцам па наборы тарфянікаў, на справе-ж аказалася зусім адваротнае. Дагавары на 1.488 чал. у пераважнай частцы заключаны фармальна. Ні праўленьні калгасаў, ні сельскія саветы аб гэтых дагаворах ня ведалі. У часе вярбоўкі ніякай растлумачальна-масавай работы не праводзілася.

Трыкутнік аказаўся нездольным замацаваць нават тых рабочых, якія зьявіліся на завод. Адсутнасьць палітвыхаваўчай работы, паяўнасьць ураўнілаўкі ў зарплаце, слабае культурна-бытавое абслугоўваньне паслужылі прычынай цякучасьці тарфянікаў. Так, напрыклад, пры ўстанаўленьні торфмашын на балоце дырэкцыя заводу пры разьліках падвяла ўсіх рабочых пад адзін разрад, заплаціла па 1 руб. 90 кап. за дзень. Горш таго, за работу ў выхадныя дні рабочыя зусім не атрымалі зарплаты.

Жыльлёвым умовам тарфянікаў не аддаецца ніякай увагі. У часе дажджу баракі, дзе жывуць рабочыя, заліваюцца вадой. Рамонт памяшканьняў не праводзіцца.

З прычыны абязьлічкі ў рабоце і недагаворанасьці паміж кіраўнікамі ёсьць вялікія прастоі машын. Быў выпадак, калі з-за нядбайнасьці памочніка мэханіка тав. **Сімакова згарэла дынамамашына.** У выпіку брыгада **Кармальсава** вымушана была зрабіць прастой у 8 гадзін. Тэхнэрсанал заводу, у прыватнасьці, тэхнарук **тав. Раканенка** і старшы мэханік **тав. Дужнікаў** не наладзілі, як сьлед, канкрэтнай, апэрацыйнай дапамогі і кіраўніцтва брыгадамі і агрэгатамі.

Некаторыя адказныя работнікі заводу праяўляюць заціск самакрытыкі. Так, работніца сталоўкі **тав. Астапкова** зьвята з работы загадчыкам торфрабкопу тав. Чарновым за тое, што яна выкрыла перад рабочымі факт самавольнага спэкуляцыйнага ўздыму цэн на прадукты ў буфэце. Другім, больш характэрным фактам заціску зьяўляецца тое, што калі ў агульна-заводжай насьцендгазэце зьявілася заметка аб радзе незаконных прадзелак з боку дырэктара, дык назаўтра заметка была сарвана.

Б.

Зрух ёсьць, але невыстарчальны

(ЛІСТ РАБОЧАГА-ТАРФЯНІКА)

Наш завод — імя 1 мая (Чашніцкі раён) усё яшчэ працуе вельмі нездавальняюча. Сутачная здабыча торфу самае большае дасягае 50 проц. заданьня. Прычынай такога становішча зьяўляецца тое, што да гэтага часу партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі заводу зусім слаба праводзілі культурна - масавую работу сярод рабочых.

Зараз у гэтым напрамку ёсьць некаторы зрух. На кожнай машыне выпускаецца штодзенка, у якой асьвятляецца работа брыгад і асобных рабочых. Дзякуючы добра пастаўленай рабоце штодзенкі, брыгады т. т. **Шчукі** і **Шарыка** значна павысілі сваю выпрацоўку. Калі раней гэтыя брыгады выконвалі сваё заданьне на 30-40 проц., дык зараз на 80-100 проц.

Асабліва вялікая работа разгорнута па ліквідацыі малаграмотнасьці сярод тарфянік. Арганізаваны ліквпункт працуе бесьперабойна — 3 разы ў тыдзень. 35 работнік з вялікай зацікаўленасьцю наведваюць заняткі ліквпунктаў.

Такім чынам пэўны зрух у разгортваньні масавай работы ёсьць, але ён далёка невыстарчальны. Заводзкім арганізацыям патрэбна гэтаму вучастку надаць больш увагі.

Гаёвы.

Агляд друку

Два вынікі

(Насьцендгазэты калгасаў „Чырвоная Рудня", „Ударнік")

Пазыка «4-ГА ЗАВЯРШАЛЬНАГА» знайшла самы гарачы водгук сярод найшырэйшых мас гораду і вёскі. Тысячы заводаў і фабрык, МТС, саўгасаў і калгасаў, дзесяткі перадавых раёнаў ужо ня толькі выкапалі, але і перавыканалі свае заданьні па рэалізацыі пазыкі. Асабліва шпарка і з посьпехам разгарнулася падпіска па гарадох.

Гэтага яшчэ нельга сказаць пра вёску. Тут мы маем значнае адставаньне. Прычыны адставаньня вёскі крыюцца перш за ўсё ў тым, што многія низавыя арганізацыі яшчэ не разгарнулі сярод мас растлумачальнай работы аб палітычных мэтах пазыкі. Дзе-ні-дзе растлумачальная работа падмяняецца простым адміністраваньнем.

Низавы друк абавязан рашуча змагацца супроць малейшых праяўленьняў адміністраваньня і прымусу. Уся рэалізацыя пазыкі павінна праходзіць толькі **на аснове глыбокай растлумачальнай работы, на аснове поўнай добраахвотнасьці.**

***

НАСЬЦЕНГАЗЭТА калгасу **«ЎДАРНІК»** (Бендараўскі сельсавет, Магілеўскага раёну) уключылася ў кампанію па рэалізацыі пазыкі са значным спазьненьнем — 21-га чэрвеня.

У першым сваім арыкуле, прысьвечаным рэалізацыі пазыкі, насьцендгазэта вельмі павярхоўна, у агульных фразах растлумачвае яе значэньне. Не зразумеўшы, што рэалізацыя пазыкі павінна праводзіцца выключна на аснове растлумачальнай работы і поўнай добраахвотнасьці, газэта з першага-ж нумару становіцца на шлях голага адміністраваньня. Усіх, хто адразу не падпісаўся на пазыку, рэдкалегія насьцендгазэты авансам залічвае ў «рады нашых ворагаў», бо

«... не падпішацца толькі вораг, які не жадае дапамагаць нам у сацыялістычным будаўніцтве».

Для таго, каб, так сказаць, падмацаваць сваю «ўстановачку», насьцендгазэта тут-жа заносіць на «чорную дошку ворагаў пазыкі» трох калгасьніц, якія яшчэ не падпісаліся на пазыку.

У гэтым — у голым адміністраваньні — першая і самая шкодная памылка насьцендгазэты. Другая памылка заключаецца ў тым, што газэта забывае пра якасны бок справы. Газэта зусім ня ставіць перад сабой задачу дабіцца таго, каб кожны калгасьнік падпісаўся на пазыку ня менш чым у разьмеры свайго трохтыднёвага даходу. Таму хто-б з калгасьнікаў не падпісаўся на пазыку хаця і на суму, значна меншую трохтыднёвага даходу, газэта неадкладна заносіць іх на чырвоную дошку, як перадавікоў (?) рэалізацыі.

Толькі 23 чэрвеня ў № 56 газэта ўспамінае што

«... нам трэба дабіцца поўнага ахопу нашых калгасьнікаў падпіскай на пазыку ў разьмеры ня менш трохтыднёвага заработку — гэта першая і асноўная задача ўсіх нашых арганізацый і камсоду нашага калгасу».

Правільна. Між тым сама газэта ні слова не сказала, як камісія садзейнасьці калгасу разгортвае масава-растлумачальную работу. Газэта па-ранейшаму адмініструе, заносячы на «чорную дошку ворагаў пазыкі» новых 4-х калгасьнікаў.

Праадміністраваўшы так тры дні і знайшоўшы «ворагаў пазыкі», газэта паведаміла аб выніках: калгас рэалізаваў пазыкі ў суме 410 руб. — менш паловы заданьня. Якая работа — такія і выпікі.

Больш да пытаньняў пазыкі насьцендгазэта калгасу «Ўдарнік» зусім не зварачалася.

***

Іншая справа — **«Ударнік 3-й бальшавіцкай»** — насьцендгазэта калгасу «Чырвоная рудня» (Жлобінскі раён). Яна своячасова і па-баявому разгарнула апэрацыйную работу ў сувязі з рэалізацыяй пазыкі.

Газэта кінула лёзунг:

— Не адставаць ад рабочых гораду і падпісацца на пазыку!

Пры непасрэдным удзеле газэты ў калгасе вылучаецца брыгада актыву для разгортваньня масавай работы па рэалізацыі пазыкі. «Ударнік 3-й бальшавіцкай» не забывае і пра аднаасобнікаў. Ён піша, што

«... кожны калгасьнік павінен быць застрэльшчыкам падпіскі на пазыку і раўняцца па рабочаму горада, а бядняк і сярэдняк — аднаасобнік павінен раўняцца па калгасьніку».

Газэта трымае пад сыстэматычным грамадзкім кантролем работу брыгады па рэалізацыі пазыкі і патрабуе, каб гэта работа праводзілася.

«... на полі, у брыгадах у часе адпачынку, у клюбе і хаце-чытальні, сярод калгаснай і аднаасобнай моладзі...»

Газэта зноў напамінае, што:

«... самае галоўнае ў тым, каб кожны брыгадзір змог РАСТЛУМАЧЫЦЬ калгасьніку і аднаасобніку — бедняку і сярэдняку вялізарнае значэньне пазыкі».

21-га чэрвеня на сваіх старонках газэта з гонарам рапартуе:

«ПАДПІСКА СКОНЧАНА Ў ВЫЗНАЧАНЫ ТЭРМІН. ПАДПІСАЛАСЯ 214 ЧЛЕНАЎ КАЛГАСУ НА СУМУ 4.280 РУБ.».

Сваёй барацьбы за рэалізацыю пазыкі насьцендгазэта на гэтым ня спыняе. Яна заклікае ўзяць на грамадзкі буксір адстаючы па рэалізацыі пазыкі сельсавет і піша, што

«... усяму калгаснаму актыву трэба не аслабляць работы па падпісцы сярод аднаасобнага сэктару, трэба дабіцца, каб аднаасобнікі пасьледавалі прыкладу калгасьнікаў і кожная гаспадарка аднаасобніка падпісалася на пазыку «4 завяршальны» ня менш, як на 40-50 руб».

***

Дзьве насьцендгазэты. Дзьве розныя работы. Два розных падыходы ў справе рэалізацыі пазыкі. Два розных вынікі. Першая —насьцендгазэта калгасу «Ўдарнік», зьмясьціўшы некалькі павярхоўных артыкулаў і сваю «чорную дошку ворагаў пазыкі», ганебна правальвае падпіску ў калгасе. Другая — насьцендгазэта калгасу «Чырвоная Рудня», узяўшы з самага пачатку правільны напрамак, зрабіўшы ўпор на глыбокую растлумачальную работу, дапамагае сваёй партарганізацыі яшчэ да 20-га чэрвеня поўнасьцю выкапаць заданьне па рэалізацыі пазыкі.

Работа насьцендгазэты калгасу «Чырвоная Рудня» павінна паслужыць прыкладам для ўсіх насьцендгазэт БССР.

Спэктаклі БДТ-2 у Менску

Сёньня ў памяшканьні Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатру распачынае гастролі **БДТ—2.** Першым паказам ідзе **«Напор»**— п'еса **Андрэя Александровіча.** У Менску тэатр паказка, апрача **«Напору»—«Вясна»** М. Ільлінскага, **«Качагары»** Гурскага, **«Амэрыка»** Станцэўскага.

Пад кіраўніцтвам партыі, БДТ—2 у сваёй рабоце рашуча змагаўся за перабудову ў адпаведнасьці з новымі задачамі, за стварэньне пралетарскага тэатру.

Пяцігадовы наш юбілей, работа ў Гомелі, двухтыднёвы ўдзел тэатру ў пасеўнай кампаніі, паказалі новыя вялікія дасягненьні ў росьце БДТ—2 за апошні год яго работы.

БДТ—2 упэўнен, што менская пралетарская грамадзкасьць сваім масавым наведваньнем яго пастановак, праз бальшавіцкую крытыку, праз актыўны ўдзел у рабоце тэатру, дапаможа нам замацаваць дасягнутыя посьпехі і перамагчы нашы слабыя месцы.

Дырэктар БДТ—2

КУДЗЕЛЬКА.

Ацэнка працадня ў калгасах

Галоўнейшымі недахопамі ў арганізацыі калгаснай працы, якія яшчэ маюць месца ў радзе калгасаў, зьяўляюцца: цякучасьць рабочай сілы, абязьлічка ў сродках вытворчасьці, безадказнасьць у вынніках работы і ўраўнілаўка ў аплаце.

Гэтыя прычыны зьніжаюць прадукцыйнасьць працы, не ствараюць матар'яльнай зацікаўленасьці калгасьнікаў у барацьбе за высокі ўраджай, за высокую прадукцыю ў жывёлагадоўлі, за зьнішчэньне страт і г. д.

Выключнае значэньне ў справе правільнай арганізацыі працы мае пастанова ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага г. г. «аб чарговых мерапрыемствах у арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў», якая дае канкрэтныя ўказаньні, як павесьці на даным этапе арганізацыю працы дзесяткаў мільёнаў калгаснага сялянства, як пабудаваць і разьвіць калгасную брыгаду, зьдзельшчыну, ударніцтва.

Арганізацыя, у адпаведнасьці з гэтай пастановай пастаянных вытворчых брыгад, якія працуюць на працягу году на поўных вучастках, ліквідуе абязьлічку палёў і ўраўнілаўку ў аплаце брыгад.

Згодна ўказаньняў ЦК УсеКП(б) «ацэнка працадня калгасьнікаў павінна павышацца або паніжацца ў залежнасьці ад пасьпяховасьці работы брыгады» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага г. г.).

Такім чынам, брыгада, якая дабілася лепшых вынікаў, павінна атрымаць і павышаную ацэнку працадня параўнальна з тымі брыгадамі, якія такіх вынікаў у рабоце ня маюць.

Сыстэма аднолькавай ацэнкі працадня, якая раней практыкавалася ў калгасах, не мабілізоўвала калгасьнікаў на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне імі плянавых заданьняў, бо калгасьнік непасрэдна ня бачыў простай залежнасьці паміж якасьцю яго працы і сумай даходу, якую ён атрымлівае ў канцы году.

Ня можа стварыць зацікаўленасьці калгасьнікаў у вынніках сваёй працы і прапанаванае некаторымі работнікамі калгасных арганізацый набаўленьне і ўрозваньне працадзён брыгадам у залежнасьці ад вынікаў іх работы, бо такая практыка вядзе да разбазарваньня працадзён і зьніжае значэньне працадня ў вачох калгасьнікаў.

Пастанова ЦК партыі гаворыць іменна аб розной ацэнцы працадня калгасьнікаў у залежнасьці ад пасьпяховасьці работы брыгад. Гэта значыць, што аб зьмяненьні колькасьці працадзён у брыгадзе ня можа быць і гутаркі.

Ацэнка працадня ў залежнасьці ад пасьпяховасьці работы брыгады стварае найлепшыя ўмовы для арганізацыі зьдзельных работ у калгасе і стымулюе павышэньне прадукцыйнасьці працы. Такая сыстэма ацэнкі працадня стварае адказнасьць брыгады за вынікі сваёй работы, дае новы стымул для больш хутчэйшага яе выкананьня і палепшэньня якасьці работы. Яна прымушае брыгадзіра і кожнага ўдзельніка брыгады сачыць за тым, каб работа выконвалася своячасова, каб затрачаныя намаганьні далі адпаведныя вынікі, каб максымальна выкарыстоўваліся рабочая сіла і сродкі вытворчасьці. Такі самакантроль унутры брыгады за работай паасобных груп, паасобных калгасьнікаў узмацняе працоўную дысцыпліну, максымальна зьнішчае нявыхады на работу і ўмацняе адыходніцтва калгасьнікаў у прамысловасьць.

Ацэнка працадня ў залежнасьці ад пасьпяховай работы брыгады, ствараючы новыя адносіны да працы, спрыяе таксама і сацыялістычнаму перавыхаваньню калгасьнікаў.

Вялікае значэньне для арганізацыі працы і ўзьнясьцця прадукцыйнасьці яе мае пастанова партыі і ўраду аб калгасным гандлі. Кожная брыгада павінна быць зацікаўлена ў тым, каб максымальна павялічыць выхад прадукцыі і тым самым стварыць умовы для больш шырокага разгортваньня калгаснага гандлю. Разгортваньне калгаснага гандлю, мабілізацыя прадуктовых рэсурсаў для гэтай справы абавязвае калгас, брыгаду і кожнага калгасьніка ў паасобку змагацца са стратамі і безгаспадарчасьцю ў расходваньні прадуктаў. Калгасны гандаль дае магчымасьць кожнай брыгадзе да пашырэньня пасеваў, да павялічэньня ўраджайнасьці і да дадатковай гадоўлі жывёлы.

Такім чынам, спрыяючы разьвіцьцю калгаснага гандлю, брыгада адначасова павышае і ацэнку свайго працадня.

У пытаньнях ацэнкі працадня мы сустракаемся з радам прапаноў, якія труба сказаць дырэктывы партыі. Вышэй мы ўжо азнаёміліся з прапановай аб набаўленьні і ўрозваньні працадзён брыгадам у залежнасьці ад вынікаў іх работы. Ясна, што ў гэтым выпадку мы сустракаемся з поўным ігнараваньнем указаньняў ЦК нашай партыі аб розной ацэнцы працадня брыгад.

Сутнасьць іншых прапаноў зводзіцца да таго, што атрыманая брыгадай прадукцыя павінна разьмяркоўвацца ёю самастойна. А гэта азначае, што брыгада, як адпаведная гаспадарчая адзінка, будзе самастойна разьмяркоўваць свае прыбыткі, самастойна выконваць заданьні, што выпадаюць на яе долю на здачы таварнай прадукцыі, па с.-г. падатку і г. д. Ня цяжка бачыць, што такі апартунізм «скончанага гаспадарчага разрахунку» вядзе да падзелу калгасу на часткі, да разбурэньня калгасу.

Большасьць прапаноў аб ацэнцы працадня ў залежнасьці ад пасьпяховасьці работы брыгады, зусім не закранае пытаньня аб тым, якімі-ж крытэрыямі карыстацца пры ацэнцы пасьпяховасьці работы брыгады, лічачы гэта пытаньне само сабой зразумелым.

Між тым, для таго, каб ацэнка працадня магла быць пастаўлена ў залежнасьць ад пасьпяховасьці работы брыгады, у першую чаргу павінна быць правільна вымерана гэта пасьпяховасьць па брыгадах, бо ў адваротным выпадку магчымы грубыя памылкі ў ацэнцы працадня і разьмеркаваньні даходаў у калгасах.

Рашаючым паказальнікам пасьпяховасьці работы брыгады за год павінна зьяўляцца атрыманая ёю колькасьць і якасьць прадукцыі. Аднак, пры параўнаньні лічбаў фактычнага выкананьня з плянавымі неабходна ўлічваць сапраўдныя прычыны, якія ўплывалі па выхад прадукцыі, неабходна ўлічваць умовы, у якіх працавала тая ці іншая брыгада.

Зусім зразумела, што пры ацэнцы пасьпяховасьці работы брыгады неабходна ўлічваць якасьць работы аднолькавай на працягу ўсяго вытворчага пэрыяду: захоўваньне тэрмінаў сяўбы і ўборкі культур, якасьць апрацоўкі глебы і сяўбы, рацыналізацыя вытворчых працэсаў і г. д. Толькі пасьля ўліку ўсіх гэтых момантаў праўленьне калгасу дае канчатковую ацэнку пасьпяховасьці работы паасобных брыгад.

Маючы ацэнку пасьпяховасьці работы брыгад, можна прыступіць да вылічэньня ацэнкі працадня па брыгадах. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што толькі працадзень тых брыгад, якія маюць ацэнку пасьпяховасьці ў 100 проц., адпавядае па якасьці плянаваму заданьню.

Возьмем для прыкладу 3 брыгады, з якіх першая брыгада выканала сваё заданьне на 100 проц. і зарабіла 500 працадзён, другая пры выкананьні заданьня на 90 проц. мае 120 працадзён. Трэцяя брыгада выканала плянавае заданьне на 120 проц. і зарабіла 750 працадзён. Зразумела, што ў якасных адносінах працадні брыгад неаднолькавыя. Так, працадзень першай брыгады якасна вышэй працадня другой брыгады, працадзень-жа трэцяй брыгады адпаведна вышэй працадня другой і першай. У адпаведнасьці з якасьцю працадня апошні павінен і ацэньвацца.

Перш за ўсё вылічым ацэнку працадня брыгады, выканаўшай план на 100 проц. Спачатку прывядзем працадні брыгад да адзінай якасьці, адпавядаючай 100 проц. выкананьню пляну. Першая брыгада выканала план на 100 проц., таму яе працадні па якасьці і адпавядаюць гэтаму заданьню. 120-жа працадзён другой брыгады будуць пры гэтым прывядзеньні адпавядаць 108 працадням (120 x 0.90). 750 працадзён трэцяй брыгады будуць адпавядаць 900 працадням (750 x 1,20).

Усяго-жа роўнаякасных, адпавядаючых плянаваму заданьню, працадзён будзе 1.508. Падзяліўшы суму трошай, падлягаючых разьмеркаваньню паміж брыгадамі, напрыклад, 3.016 руб. на 1.508, мы атрымаем 2 руб., г. зн. ацэнку працадня пры 100 проц. выкананьні пляну. Для вылічэньня ацэнкі працадня другой брыгады даволі памножыць 2 руб. на 10 проц., атрымаецца 1 руб. 80 кап. Ацэнка-ж працадня трэцяй брыгады будзе 3 руб. 40 кап. (120 проц. ад 2 руб.).

Такім чынам мы бачым простую залежнасьць паміж пасьпяховасьцю работы брыгад і ацэнкай іх працадня. Увядзеньне дыферэнцыяванай ацэнкі працадня забясьпечвае ліквідацыю ўраўнілаўкі ў разьмеркаваньні прыбыткаў паміж брыгадамі і стварае ў кожнай брыгадзе, у кожнага калгасьніка стымул для павышэньня прадукцыйнасьці працы.

Такая сыстэма ацэнкі працадня будзе таксама спрыяць ліквідацыі ўраўнілаўкі і абязьлічкі ўнутры брыгады, правільнаму пра вядзеньню зьдзельшчыны па ўсіх работах, бо брыгада здолее дабіцца большай пасьпяховасьці ў рабоце, павышэньня ўраджайнасьці і г. д., калі ўнутры яе ня будзе ўраўнілаўкі і абязьлічкі, ня будзе гультаёў, ня будзе тых, хто дрэнай якасьцю сваёй работы зьніжае агульны даход усёй брыгады.

Клясавы ворат, пацярпеўшы паражэньне ў адкрытай вайне супроць калектывізацыі, імкнецца шкодніцкай работай з сярэдзіны разбурыць калгасы. Лёза яго зброі зараз накіравана супроць арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, бо кулак добра ведае, што ад апошняга залежыць посьпех усяго калгаснага руху. Практычнае ажыцьцяўленьне ацэнкі працадня ў залежнасьці ад пасьпяховасьці работы брыгады выклікае новае шалёнае супраціўленьне з боку кулака і яго агентуры ў калгасах. Усе сілы клясавага ворага будуць накіраваны на зрыў гэтага мерапрыемства, якое мае мэтай умацаваньне пастаяннай вытворчай брыгады.

Толькі ў рашучай барацьбе з кулаком і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі мы дабіемся рашаючых посьпехаў у праведзеньні ўсіх мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Брыгада НДКІ:
КАПЛІНСКІ Е., БРОЎКІН Т.

*) У параўнаньні прапаноў.

Уключайцеся ў рэйд-праверку прасоўваньня тавараў у вёску

„Неабходна, каб прамтавары сапраўды поўнасьцю дайшлі да вёскі... Для гэтага неабходны ўзмоцнены кантроль за прасоўваньнем тавараў на месцы, за прасоўваньнем прамысловых тавараў у вёску“. (МОЛАТАЎ. З прамовы на III-й Усеукраінскай партканфэрэнцыі)

Усебеларускі дэкаднік праверкі прасоўваньня тавараў шырокага спажываньня ў вёску

З мэтай поўнага і своечасовага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб прасоўваньні тавараў у вёску ЦКК НК-РСІ Бел., ЦК ЛКСМБ і ЦП саюзу працаўнікоў каапэрацыі і дзяржгандлю пастанаўляюць сумесна з рэдакцыямі «Зьвязды» і «Рабочага» ўключыцца ў абвешчаны ЦКК НК-РСІ СССР і рэдакцыяй СКТ **дэкаднік рэйду па праверцы прасоўваньня тавараў у вёску.**

Дэкаднік праводзіцца па Беларусі з 25 ліпеня па 5 жніўня, для чаго:

1) Прапанаваць усім гар. і райКК-РСІ, ЛКСМБ, мясцоваму друку і мясцовым органам саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю зараз-жа ўключыцца ў абвешчаны рэйд-праверку.

2) Правяраецца завоз наступных тавараў: бавоўняна-папяровай тканіны, сукопнай і ваўнянай тканіны, абутку, швэйных вырабаў, мыла, махоркі, солі, запалак, мэтызаў, галёш.

Асноўнымі пытаньнямі праверкі зьяўляюцца:

3) **На прадпрыемствах:** а) ці не затрымліваецца вырабі адгрузка тавараў вясковага асартымэнту з-за адсутнасьці на радаў і сэкадыфікацый, б) ход выкананьня вытворчай праграмы па таварах шырспажыву, в) забясьпечанасьць упаковачным матар'ялам і перавозачымі сродкамі, г) становішча ўліку і справаздачнасьці на адгрузках,

4) **На выхадных базах:** а) ці не затрымліваецца адгрузка тавараў з-за адсутнасьці нарадаў, б) ці ёсьць плян выкананьня нарадаў па тэрмінах і фактычнае выкананьне гэтых плянаў, в) забясьпечанасьць баз тарай і ўпаковачным матар'ялам, г) нагрузка, адпраўка тавараў чыгункай і своечасовасьць выпіскі рахункаў і транспартных дакумантаў, д) становішча ўліку і справаздачнасьці, е) **ці правяраюцца выхадныя базы абутковай і швэйнай прамысловасьці у Менску, Віцебску, і Гомелі.**

5) **На чыгуначных вузлох і перавалачных пунктах:** а) ці не затрымліваюцца вагоны з таварамі шырспажыву для вёскі, б) ці не назіраецца скапленьне тавараў шырспажыву, пры перавалцы з водных шляхоў на чыгунку і наадварот,

6) **На гуртовых базах прамысловасьці і Белкаапсаюзу:** а) хуткасьць прасоўваньня тавараў у міжраённыя базы і склады райсаюзаў, б) ці выконваецца першачарговасьць нагрузкі для вёскі, в) выкананьне пляну адгрузак вёсцы, г) становішча ўліку і справаздачнасьці на базах, д) ці адгружаюцца тавары міжраённым базам і райсаюзам з улікам наяўнасьці колькасьці і асартымэнту астач тавараў на базах.

7) **На міжраённых базах і райсаюзах:** а) закупка і паступленьне тавараў, б) фактычнае давядзеньне тавараў шырспажыву да сельспажыўтаварыстваў (колькасьць, тэрміны) в) становішча ўліку і справаздачнасьці.

8) **У сельспажыўтаварыстве:** а) ці адпавядаюць тавары, што атрымліваюцца, попыту калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, б) ці не практыкуецца просты тавараабмен і прымусовы асартымэнт, в) становішча ўліку і справаздачнасьці, г) як абслугоўваецца калгаснік і працоўны аднаасобнік у часе палявых работ (ці праводзіцца гандаль да і пасьля палявых работ, ці арганізован развозны гандаль) і г. д.

9) **Формы і мэтады работы:** пры кожным аб'екце арганізуюцца кантрольныя сыгнальныя пасты ў складзе прадстаўнікоў НК-РСІ (гарадзкія і раённыя), рабочых, лёгкай кавалерыі, камсамолу, саюзу працаўнікоў каапэрацыі і дзяржгандлю, друку і калгасасоюзу.

Адначасова з гэтым задача рэйду зьяўляецца ня толькі канстатаваць недахопы, а галоўным чынам дапамагчы на-ходу зьнішчыць усе недахопы і памылкі.

10. Для кіраўніцтва рэйдам стварыць пры ЦКК-РСІ **штаб** з прадстаўнікоў: ЦКК НК-РСІ—**т. Гетнэр** (старшыня), рэдакцыі «Зьвязда», «Рабочий», ЛКСМБ, ЦП саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю.

Аналёгічныя штабы арганізаваць на месцах.

11) Матар'ялы рэйду павінны асьвятляцца ў друку, адначасова паведамляцца мясцовым органам КК-РСІ.

12) Пасьля сканчэньня рэйду ў 2-хдзённы тэрмін гар і РКК-РСІ павінны прысылаць поўны матар'ял аб выніках праведзенага рэйду.

ЦКК НК-РСІ.
Рэдакцыя «Зьвязды».
Рэдакцыя «Рабочий».
ЦК ЛКСМБ.
ЦП Саюзу працаўнікоў каапэрацыі і дзяржгандлю.

Вынік злачыннай работы

ГЛУСК.

З 1 чэрвеня па 8 ліпеня райсаюзам кінута ў вёску тавараў шырокага спажываньня на 239.320 руб. Рэалізуюцца-ж гэтыя тавары ня так, як гэтага патрабуюць дырэктывы партыі і ўраду.

Праўленьне райсаюзу дагэтуль яшчэ ні вылучыла асартымэнту найбольш ходкіх тавараў, не арганізавала завоз сэзонных тавараў да сенаўборкі, уборачнай кампаніі.

Намесьнік старшыні Плятнянскага сельспажыўтаварыства дае крамнікам такую «ўстаноўку»: «Усё на пай, а дэфіцытныя тавары — на загатоўкі». Старшыня Гарадкоўскага сельспажыўтаварыства перадае часку тавараў загатоўчаму пункту для загатовак. Старшыня Глускага сельспажыўтаварыства тав. **Грамыка** стварае пейкія браніяваныя фонды прамтавараў, забараняючы крамнікам прадаваць боты, што ёсьць. Старшыня Дакольскага сельсавету забараніў крамніку прадаваць тавары з крамы і прапанаваў разьмеркаваць іх па калгасах.

А праўленьне райсаюзу ня ведае аб гэтых фактах грубейшага скрыўленьня дырэктыў партыі, ня ведае як прасоўваюцца тавары з сельспажыўтаварыстваў да спажыўца, як і каму прадаюць гэтыя тавары крамнікі.

Гэта вынік адсутнасьці канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку райсаюзу сваёй пісоўкай.

Бюро райкому партыі ўжо вынесла сваё рашэньне па гэтых фактах скажэньня лініі партыі ў галіне савецкага гандлю. **Старшыня Глускага сельспажыўтаварыства Грамыка зьнят з работы і выключан з партыі.**

Пракурор ў тэрміновым парадку распачаў расьсьледваньне фактаў замарожваньня тавараў у Клятнянскім сельспажыўтаварыстве.

С. К.

Капусту—ЗРК. (менская вопытная валотная станцыя).

Райспажыўсаюз замарожвае таваразварот

ВІЦЕБСК.

Віцебскі райсаюз ня выконвае дырэктыў партыі і ўраду аб хуткім прасоўваньні ў вёску прамтавараў з улікам патрэбнага спажыўцу асартымэнту. На складах райспажыўсаюзу — вялізная залежы розных тавараў — 300 штук стаговых віл, матыг на 1.800 руб. і інш. Усё гэта ляжыць мёртвым капіталам і шякіх захадаў да прасоўваньня ў сельспажыўтаварыствы ня прымаецца.

Вось ужо некалькі месяцаў, як на складзе райспажыўсаюзу замарожана 40 мужчынскіх палто, некалькі соцень сітаў для прасейваньня мукі, 50 бітонаў для малака і 10 тэрмасаў.

Амаль усе сельспажыўтаварыствы адчуваюць недахват цукру, а ў гэты час больш 10 мяшкоў з цукрам ляжыць на складзе. У Замастоцкім і іншых сельспажыўтаварыствах няма парфюмэрных тавараў і туалетнага мыла, а на складзе райсаюзу гэтыя тавары ёсьць у значнай колькасьці.

20 чэрвеня віцебская база Белкаапсаюзу ў парадку **прымусовага асартымэнту** накіравала райспажыўсаюзу 200 зімовых шапак на 3.400 руб. Працаўнікі райспажыўсаюзу замест таго, каб рашуча эмагацца з прымусовым асартымэнтам, забралі гэтыя шапкі, часткова даслаўшы іх у сельспажыўтаварыства, дзе яны і зараз ляжаць нераалізаванымі, астатнія марыпуюцца на складзе.

Няма таксама прадметаў шырокага спажываньня, якія вырабляюцца мясцовай прамысловасьцю. Райспажыўсаюз нічога ня робіць, каб заключыць дагавары з сампрамарцелямі на тавары шырспажыву, якія-б значна дапоўнілі асартымэнт тавараў сельспажыўтаварыства.

Няплянавымі закупкамі ў раёне ніхто не займаецца. Закупачнае бюро пры райспажыўсаюзе не арганізавана. 14 сельспажыўтаварыстваў фактычна прадастаўлены самім сабе, імі ніхто ня кіруе, іх ня вучаць, як трэба па-сапраўднаму разгортваць савецкі гандаль. Таму ня дзіўна, што плян таваразвароту па сетцы райспажыўсаюзу складаў у другім квартале 640 тыс. руб. замест 800 тыс. руб. Таварным-ж астачы сельспажыўтаварыстваў растуць. Да пачатку трэцяга кварталу яны павінны былі складаць 104 тыс. руб., фактычна-ж склалі 221 тыс. руб. З 14 сельспажыўтаварыстваў толькі 4 працуюць рэнтабэльна, астатнія—з дэфіцытам.

Арк. Зарубежны,
Р. Вярхоўскі.

Шацкі сельсавет трэба аздаравіць

(ЛІСТ РАБОЧАГА).

У **Шацкай ашчадкасе** замест прытоку ўкладаў наглядаецца значная ўцечка сабраных сродкаў. Гэта тлумачыцца адсутнасьцю ўсякай работы па вярбоўцы сродкаў.

Недахват сродкаў у касе паслужыў прычынай зрыву своечасовай выплаты зарплаты рабочым.

Работа па рэалізацыі пазыкі **«чацьверты заключны»** пастаўлена зусім дрэнна. **Шацкі сельсавет не забясьпечыў шырокай растлумачальнай работы** сярод працоўнага насельніцтва сельсавету. Самацёк у гэтай важнейшай справе вельмі дрэнна адбіваецца на рэалізацыі пазыкі. Плян падпіскі да гэтага часу далёка яшчэ ня выкананы.

У работе Шацкага сельсавету ёсьць яшчэ шмат прарываў.

Пры ўліку аб'ектаў абкладаньня с.-г. падаткам пікай растлумачальнай работы не праводзілася і **наліччыньне падатку зроблена габінэтным парадкам.** Гэта прывяло да няправільнага ўліку і шалічэньня падатку.

Гэтым-жа сельсаветам дано цьвёрдае заданьне бяднацка - серадняцкім гаспадаркам па здачы малака, прычым цьвёрдае заданьне даецца членамі сельсавету, без зацьвярджэньня прэзыдыуму.

Пухавіцкі райвыканком павінен зьвярнуць увагу на работу Шацкага сельсавету і прыняць захады да аздараўленьня яго.

Ліўшыц.

Хвошчыкаў зрывае ўборку

(Ліст рабочых Гомельскага дэпо)

Ячэйкай КП(б)Б **Гомельскага старога дэпо** мы былі пасланы ў падшэфны калгас **Буда - Кашалёўскага раёну «Ураджай»** для рамонту с.-г. інвэнтару.

Прабыўшы ў калгасе 6 дзён, намі былі заўважаны наступныя недахопы ў калгасе. Інвэнтар, надзвычай неабходны ў гэты час, як касарка, граблі, жнявярка і інш. уборачны інвэнтар, знаходзіцца ў самым дрэнным стане. Нават рамантаваць яго няма магчымасьці, бо праўленьне калгасу не закупіла запасных частак да гэтых машын.

Старшыня калгасу Хвошчыкаў зусім пядбайна адносіцца да калгаснай гаспадаркі. Ня гледзячы на тое, што ў калгасе ёсьць кузьня, якая ўкамплектавана патрэбнымі кадрамі і інвэнтаром, яна не спраўляецца з рамонтам. Гэта тлумачыцца тым, што каваль і малатабоец, якія працуюць у кузьні, працуюць бескантрольна, яны бяруць за казы з боку, пакідаючы рамонт калгаснага інвэнтару.

Хвошчыкаў дапускае самыя агіднейшыя адносіны да калгаснікаў. На пытаньне калгаснікаў — як рабочыя глядзяць на тыя прадукты, якія калгас вывозіць на базар і, куды расходуюцца грошы, атрыманыя ад продажу прадуктаў,—Хвошчыкаў адказвае:

—Гэта ня ваша справа, вы ня будзеце мяне кантраляваць. Я тут гаспадар.

Хвошчыкаў не апраўдвае назвы члена партыі. Ён заядлы гультай. Калі калгаснікі з самай раніцы выходзяць на працу, дык старшыня калгасу Хвошчыкаў **выходзіць на работу а 10-12 гадзіне.** Ён ня цікавіцца, ці вышлі калгаснікі на работу, ці не. Яму гэта ўсёроўна.

У гарачы час уборкі Хвошчыкаў дае нарад аднаму з калгаснікаў паехаць у раён і **прывезьці вэтфэльчэра для лячэньня яго... сабакі. У той час ён адмаўляе калгаснику ў падвозе для паездкі за доктарам для лячэньня дзіцяці.**

Калгаснікі кажуць, што калі Хвошчыкаў надалей застанецца кіраўніком калгасу, можа сарвацца ўборка.

Пікіх сходаў у калгасе і наогул арганізацыйна-масавай работы не праводзіцца. Самакрытыка і ўдарніцтва не разгорнута. «Работа» Хвошчыкава стварае небясьпеку справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасу.

Мядзьведзяў.

Нячуваная цеганіна

(Ліст работніцы)

На працягу 9-ці год я працавала ў нашых савецкіх сталоўках. За 9 год я ня мела ні адной заўвагі аб дрэннай рабоце. Сёньня я пакарана **звальненьнем з працы.** Гэта пакараньне на мяне накладзена загадчыкам **Віцебскай сталовай № 32 Шубікам** за тое, што я на сходзе **выкрывала яго злачынствы.** Шубік займаецца **разбазаваньнем** прадуктаў, **сарваў дзіцячыя сьнеданьні, груба абыходзіцца з рабочымі сталовай.**

Шубік за 1 год зволіў з працы **5 работніц** за тое-ж самае, што і мяне. На яго былі заведзены 4 судовыя справы. Усе **гэтыя справы былі вырашаны ў карысьць работніц.** Судовыя органы на працягу цэлага году няньчыліся з **Шубікам,** даючы яму магчымасьць зьдзекавацца над работніцамі.

Завязалася 5-я справа. Гэта мая справа.

Яна скруцілася ў такі тугі вузел, што нашы судова - сьледчыя органы **на працягу вось ужо 4-х месяцаў** ніяк ня могуць яго разьвязаць.

Віцебская працэсія пастанавіла вярнуць мяне ў сталовую на старое месца працы ў якасьці буфэтчыцы. Суд вырашыў справу ў маю карысьць. Я засталася гэтым вельзадоволена.

На вялікі жаль, радасьць мая была заўчасная.

Новая загадчыца сталовай № 32 аказалася пад уплывам Шубіка. Яна катэгарычна адмовілася выканаць пастанову працэсіі.

У нас няма месц,—быў кароткі і рашучы адказ новай загадчыцы.

11-га мая я зьвярнулася да памочніка пракурора гор. Віцебску т. Сокалавай.

— **Добра,** — сказала Сокалава,—**дайце мне ваш выканаўчы аркуш, я ўсё ўладжу.**

Спрага зацягваецца. Мне, як беспрацоўнай становішча ўсё цяжай і я зноў іду да Сокалавай.

—Ідзеце атрымайце кампэнсацыю і мяне больш ня турбуйце, — адказала мне Сокалава.

Гэты адказ для мяне быў зусім нечаканы. **Як гэта, дык я не магу і ў пракуратуры знайсьці праўды?**—спаўстала перада мной балючае пытаньне.

Ня ведаючы, куды больш зьвярнуцца, я пайшла зайсьці ў **гарКК-РСІ.** На запатрабаваньне РСІ, Сокалава адказала, што маю справу накіравала ў Вярхоўны суд рэспублікі. Гэта было **13-га мая.**

Як пазьней высьветлілася, Сокалава «ўтерла очки» РСІ. Яна накіравала маю справу ў Вярхоўны суд рэспублікі толькі **3-га чэрвеня.**

Вярхоўны суд 15 чэрвеня г. г. падтвердзіў пастанову працоўнай сэсіі ў адкаўленьні мяне на працы ў сталовай № 32.

Сёньня ўжо праходзіць ліпень месяц, а **я застаюся беспрацоўнай, бо** наша Віцебская сталовая № 32, відаць, лічыць дзіцяцяй пастанову Вярхоўнага суда неабавязковай і **ня прымае мяне на працу.**

БЕЛЯЎСКАЯ.

Ад рэдакцыі: «Зьвязда» чакае ад Віцебскай пракуратуры неадкладнага выкананьня пастановы Вярхоўнага суда наконт справы Беляўскай, прыцягненьня вінаватых у цеганіне, па справе Беляўскай да адказнасьці і тэрміновага паведамленьня аб выніках.

Калі мне выдадуць карову?

(ЛІСТ КАЛГАСЬНІКА).

У шклоўскай канторы «Заготкывёла» ніяк нельга дабіцца абмену каровы. Калі здасі на мяса ялаўку, замест якой належыць атрымаць малочную карову, дык трэба чакаць атрыманьня цэлага паўгода.

Загадчык канторы **Чаплюк** выдае ў першую чаргу кароў сваім знаёмым. Ён наогул бюракратычна адносіцца да гэтай важнай справы.

Я, калгаснік з калгасу **«Чырвоны араты», Гарадзішчанскага сельсавету,** здаў сваю ялавую карову для абмену на малочную яшчэ ў маі месяцы. **Вось ужо другі месяц, як я хаджу да Чаплюка за 25 вёрст** і ніяк не магу дабіцца атрыманьня каровы. **Чаплюк** усё кажа, што няма кароў. Але гэта хлусьня. Каровы ёсьць, толькі **Чаплюк** выдае іх таму, хто яму больш падабаецца.

Ці не пара **шклоўскай РСІ** зацікавіцца бюракратычнымі ўчынкамі Чаплюка і прымусіць яго выдаць мне карову?

М. Мядзьведзяў.

Незразумелая ўпартасьць

(Ліст работніцы фабрыкі імя 1 мая)

Я скончыла школу **ФЗВ** і пачала працаваць на фабрыцы **«1 мая».** Прапрацаваўшы **9 месяцаў, я захварэла.** Медыцынская **кантрольная камісія** прызначыла мне дыэтычнае харчаваньне. Але наш **фабком не аказаў мне дапамогі.** Я засталася без вызначанага мне харчаваньня і пачала яшчэ горш сябе адчуваць. У мяне ад хваробы былі **частыя прыпадкі** і кантрольная камісія забараніла мне зусім працаваць на гэтым прадпрыемстве. Але дырэктар фабрыкі гаворыць: «Калі на цябе патрацілі грошы пры навучаньні ў ФЗВ, дык ты павінна працаваць».

Я зьвяртаюся да «Зьвязды» за дапамогаю.

Ліўшыц.

Ад рэдакцыі: «Зьвязда» чакае ад дырэкцыі фабрыкі «1 мая» тлумачэньня па сутнасьці гэтага лісту.

Насустрач калгаснаму гандлю

НА ЗАВОДАХ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА І „КАМУНАР“ РАБОТА БРЫГАД ПА ВЫРАБУ ТАВАРАЎШЫРСПАЖЫВУ НЕ АРГАНІЗАВАНА

Дзесяткі тон каштоўных адкідаў не скарыстоўваюцца

Наш завод прыступіў да вырабу прадметаў шырокага спажываньня ня так даўно, прыблізна з другой паловы чэрвеня. Пасьля атрыманьня кантрольнай лічбы ад Белмэталяаб'яднаньня, у кавальскім цэху створана спэцыяльная брыгада ў колькасьці 10 чал. За кароткі час брыгада дабілася значных посьпехаў. На 20 ліпеня вырублена прадметаў шырспажыву рознага асартымэнту на 30 тыс. руб. Зроблена 7 тыс. завес, 31 тысяча крукоў для завес, 1.500 шт. адвалаў, 2.500 лемяхоў, 1.000 паласкоў, 1.000 шт. накладак на восі, 300 конскіх падвоў, 220 вотос, 650 шворнаў, 50 трыножак і інш. рэчы.

Зразумела, калі ўлічыць магчымасьці заводу, дык гэтыя посьпехі зусім нязначныя. При большым скарыстаньні адкідаў, якіх за заводзе вялікая колькасьць, можна было-б даць тавараў у некалькі раз больш.

На шляху вырабу прадметаў шырокага спажываньня ёсьць рад буйнейшых перашкод. Узяць хаця-б пытаньне ўкамплектаваньня брыгады рабочай сілай. З самага пачатку ў ёй працавала 10 чалавек. Зараз брыгада зьмяншылася напалову. Рабочыя, якія працавалі раней у брыгадзе, дырэкцыяй заводу забраны на іншую работу. Мне, як брыгадзіру, прыходзіцца клапаціцца аб укамплектаваньні брыгады аднаведным складам, але дырэкцыя мала зварачае ўвагі на гэта пытаньне.

Справа з расцэнкамі і ўлікам эфэктыўнасьці працы брыгады зусім дрэнная.

Ня лепш стаіць справа з бытавымі ўмовамі рабочых. Некаторых рабочых, якія нядаўна прыняты на завод, памясьцілі ў невялічкі пакой інтэрнату, дзе жыве 12 чалавек. Вокны ў такоі амаль усе разьбіты, дзьверы на ключ не зачыняюцца. З гэтай прычыны часта бываюць пакражы. Адміністрацыя заводу не клапоціцца, каб прывесьці інтэрнат у належны парадак.

Партколектыў, заўком і дырэкцыя заводу па пытаньні шырспажыву ня раз выносілі прытожыя рэзалюцыі, але практычна зроблена вельмі мала. Дапамога брыгадзе ў наладжваньні працы аказваецца зусім нязначная.

Па заводзе яшчэ і да гэтага часу ў розных кутках валяюцца дзесяткі тон мэталёвых

адкідаў. Збор іх праходзіць надзвычай марудна.

Да 10 жніўня на заводзе павінен уступіць у строй спэцыяльны уцільцэх, у якім будзе працаваць 16 рабочых. Аднак, абсталяваньне цэху ідзе вельмі марудна. Белмэталяаб'яднаньне таксама амаль не аказвае дапамогі. Давяло да заводу кантрольныя лічбы і думае, што на гэтым справа па шырспажыве скончана.

Брыгадзір КЛЮЧ.

Заўком вылучыў камісію...

Па вырабу прадметаў шырокага спажываньня нашаму заводу пакуль што няма чым хваліцца. Выраб распачат толькі ў першых лічбах ліпеня. Працуюць па гэтай галіне тры спэцыяльна створаныя брыгады. У кавальскім цэху — 6 чал., у жасьцяным — 5, у сьлясарным — таксама 6. За першыя дзьве дэкады ліпеня ўсе тры брыгады разам выпусьцілі прадукцыі шырокага спажываньня ўсяго на 5.327 руб. Зроблена 115 сякер, 1.109 ухватаў, 598 малаткоў, 36 качэрг, 72 петлі для варот, 383 самаварных труб, 1183 шуфэлькаў для вугалю, 120 засланак для кухонных печаў, 257 трыножак і 50 штук матыг. Апрача гэтага, як дадатковая прадукцыя шырспажыву, вырабляюцца бакі для варкі бялізны, бэтоны для малака і цісі. Гэтымі днямі заканчваецца выраб першай партыі бакаў у колькасьці 450 штук.

Зараз па ўсіх цэхах і асабліва ў брыгадах, якія вырабляюць шырспажыў, разгорнут збор рацыяналізатарскіх прапаноў.

Але ўсё зробленае трэба лічыць невыстарчальным. Магчымасьці па скарыстаньні адкідаў вычэрпваюцца далёка ня поўнасьцю. Тлумачыцца гэта тым, што заводакіраўніцтва яшчэ ня ўзялося як сьлед за ажыцьцяўленьне гэтага важнейшага мерапрыемства.

Заўкомам вылучана спэцыяльная камісія, на якую ўскладзена адказнасьць за выраб прадметаў шырокага спажываньня. Але, адкрыта кажучы, гэта камісія да сёнешняга дня бязьдзейнічае. На заводзе не сабраны яшчэ поўнасьцю ў адно месца адкіды мэталю і жэсьці. Мне зараз, як брыгадзіру, прыходзіцца траціць час на збор гэтых адкідаў.

Зразумела, што пры такіх тэмпах нельга забясьпечыць поўнае выкананьне кантрольнай лічбы ў 120.425 руб. на трэці квартал. Тэмпы вырабу шырспажыву трэба максымальна ўзьняць.

Мэталяаб'яднаньне, даўшы плян заводу, на гэтым супакоілася. Ні адзін з прадстаўнікоў аб'яднаньня на заводзе яшчэ ня быў.

З рэалізацыяй прадукцыі таксама ня зусім добра. Так, напрыклад, у першай дэкадзе ліпеня з 67 вырабленых сякер рэалізавана толькі 40, з 860 ухватаў — 600, з 495 малаткоў — 350, з 620 самаварных труб — 370. Астатняя прадукцыя ляжала нерэалізаванай да 23 ліпеня. Прычынай гэтаму зьяўляецца непаваротлівасьць заводзкага стала збыту.

Брыгадзір ЛІПНІЦКІ.

Шырспажыў у Шклове—забыты вучастак работы

Дырэктывы партыі і ўраду аб вырабе прадметаў шырокага спажываньня ў Шклове яўна ігнаруюцца. У горадзе ёсьць каля 5 прадпрыемстваў: папяровая фабрыка «Спартак», ільназавод імя Сталіна, лесазавод «Барацьба» і райпрамсаюз, які аб'яднае швэйную, абутковую, кавальную і вяровачныя арцелі. Але да сёнешняга дня, ні адно з гэтых прадпрыемстваў не прыступіла да практычнай работы па шырспажыву. Пры поўным скарыстаньні адкідаў кожны год можна было вырабляць на дзесяткі тысяч рублёў прадметаў шырокага спажываньня. Так, напрыклад, на фабрыцы «Спартак» штодзённа прападае марна дзесяткі тон паперы, якую можна было-б скарыстаць на выраб канвертаў, кніжак курыцельнай паперы, на блёкнэты, сшыткі для маляваньня і інш. На лесазаводзе «Барацьба» з дрыўляных адкідаў ёсьць магчымасьць вырабляць табурэткі, вакопныя рамы і школьныя прылады (пэналы, лінейкі і інш.).

Нямала прападае адкідаў і на ільназаводзе імя Сталіна. Пры скарыстаньні апошніх завод можа вырабляць вяроўкі, лейцы. Аднак, усе гэтыя магчымасьці да сёнешняга дня не ператвораны ў сапраўднасьць.

Райпрамсаюз яшчэ ў чэрвені атрымаў заданьне выпусьціць у 3 квартале тавараў шырокага спажываньня на 99300 руб. Між тым, даннае пытаньне яшчэ не абгаварвалася.

Загадчык шавецкай арцелі ўпарта не жадае займацца вырабам тавараў шырспажыву, тлумачачы гэта нібы адсутнасьцю адкідаў.

Васілеўскі.

Тав. Літвінаў зрывае маскі з сабатажнікаў раззбраеньня

Прамова тав. Літвінава на пасяджэньні генэральнай камісіі

ЖЭНЭВА, 22. Для ўгрунтаваньня савецкіх паправак да праекту рэзалюцыі Бэнеша тав. Літвінаў выступіў у генэральнай камісіі з наступнай прамовай:

— Старшыня выказваў учора боязьнь адносна магчымай працяжнасьці нашых прамоў. Ня ведаю, ці будзе расьсеяна яго боязьнь тым, што мая прамова будзе вельмі кароткай у параўнаньні з часамі, які нас прымусілі чакаць да зьяўленьня сёньняшняй рэзалюцыі. Калі вёнскі кангрэс прынята называць цяпер «весялящимся конгрессом», дык цяперашняя канфэрэнцыя, напэўна, увойдзе ў гісторыю пад назвай **«нафэрэнцыі ў чаканьні»**. Я рад быў-бы не ўпамінаць гэтай акалічнасьці, калі-б мы былі ўзнагароджаны за нашу доўгацярпліваесьць рэзультатамі чаканьня, але, на жаль гэта ня так.

Рэзалюцыя, якая нам прапануецца і якая выпрацоўвалася і чакалася членамі дэлегацый на працягу некалькіх тыдняў, калі ня месяцаў, павінна прадстаўляць сабой, відавочна, вынік усіх дасягненьняў канфэрэнцыі за 6 месяцаў яе існаваньня і папярэдняй падрыхтоўчай работы, у той-жа час максымальную праграму работ наступнага этапу канфэрэнцыі. Мне здаецца, што мы ўсе ня можам не сазнацца, што **гэта рэзалюцыя прынясе горкае расчараваньне ўсім тым людзям і арганізацыям, якія ўскладалі ўсе свае надзеі ў галіне міру на канфэрэнцыю, і апраўдае сумныя прадпрачаньні і прадчуцьці тых, якія гэтых надзей з самага пачатку не падзяялі.**

Хаця рэзалюцыя пачынаецца са сьцьвярджэньня, што настаў час для прыняцьця ўсімі народамі сьвету істотных і шырокіх мераў прыемства па разбраеньні для кансалідацыі ўсеагульнага міру, увесь далейшы зьмест гэтай рэзалюцыі зьяўляецца поўным адмаўленьнем гэтага сьцьвярджэньня і, наадварот прызнаньнем таго, што прадстаўленыя на канфэрэнцыі дзяржавы не знайшлі момант найсьпеўшым для канчатковага прыняцьця хаця-б адной рашучай меры па раззбраеньні.

Праект рэзалюцыі—рашучы крок назад

Я дазволю сабе прааналізаваць рэзалюцыю пункт за пунктам. Я ня буду спыняцца на агульных дэкларацыях і неакрэсьленых абяцанках адносна магчымых будучых рашэньняў. Гэтых дэкларацый было на канфэрэнцыі больш, чым выстарчальна. Больш таго, ужо 18 красавіка генкамісія пастанавіла, што гэта канфэрэнцыя павінна завяршыць рашучы этап у скарачэньні ўзбраеньняў да найбольш нізкага ўзроўню. Рэзалюцыя, якая нам прапануецца, паўтарае толькі гэту пастанову аб першым рашучым кроку, не ўказаючы ні аднэй лічбай узроўень узбраеньняў, якія скарачаюцца. Я буду закранаць, таму, толькі тыя канкрэтныя станоўчыя рашэньні адносна якіх, нібы ёсьць ужо агульная згода.

Такіх канкрэтных пастаноў ёсьць у рэзалюцыі, на жаль, толькі адна, а іменна **адносна хэмічнай, бактэрыялёгічнай і агнявой вайны.** Але гэта пастанова ў сваіх асноўных частках заключаецца ў канвэнцыі аб хэмічнай і бактэрыялёгічнай вайне, прынятай пад назвай жэнэўскага пратаколу яшчэ ў 1925 годзе. Гэты пратакол ратыфікаваны ўжо 34 дзяржавамі, у тым ліку Савецкім Саюзам, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Італіяй і Германіяй. Гэты дагавор ўжо ўступіў у моц паміж дзяржавамі, якія фармальна яго прынялі. Калі асталіся дзяржавы, не падпісаўшыя, або не ратыфікаваўшы пратаколу, згодна з ім, ім застаецца толькі абгэтым заявіць фармальна і дагавор атрымае ўсеагульнае застасаваньне. Калі замест гэтага нам зараз прапануюць неакрэсьленую рэзалюцыю, складзеную ў агульных выразах аб ухваленьні рэкамэндацыі тэхнічных камісій, з поваду яких, напэўна, магчымы яшчэ далейшыя спрэчкі і якія могуць прыняць форму абавязацельства толькі праз аддалены час, **дык мы ў даным выпадку маем права гаварыць аб рашучым кроку назад, а не наперад. Таму, ні ў якім выпадку, пункт рэзалюцыі аб хэмічай і бактэрыялёгічнай вайне нельга выкасоўваць за дасягненьне цяперашняй канфэрэнцыі.**

Я ня гаварыў аб тым, што гэта пытаньне, як і іншыя пытаньні аб гуманізацыі вайны, адносіцца хутчэй да кампэтэнцыі саюзу Чырвонага крыжу, чым да канфэрэнцыі па разбраеньні. У рэкамэндацыях тэхнічнай камісіі савецкая дэлегацыя не знаходзіць сур'ёзных палепшэньняў у параўнаньні з жэнэўскім пратаколам 1925 году, а калі ў іх ёсьць што-небудзь дадатковае, дык гэта павінна-быць-небудзь дадатковае, дык гэта павінна-быць-ло-б склаўці прадмет дадатковага пратаколу і не павінна даваць нам повану паставіць пад пытаньне ўжо існуючыя ў гэтай галіне міжнародныя абавязацельствы і даваць урадам повад не далучацца да гэтых абавязацельстваў і не ратыфікаваць іх.

Пункт аб забароне бамбардыроўкі грамадзянскага насельніцтва можна вітаць, але і ён адносіцца хутчэй да прадметаў гуманізацыі, г. зн. да галіны Чырвонага Крыжу, чым да пытаньняў раззбраеньня, бо гэты пункт сам па сабе не азначае скарачэньня ваеннай авіяцыі, хоць-бы на адну адзінку. У тэорыі права бамбардыроўкі крамадзянскага насельніцтва ад навстрашай накіроўвалася супроць ваенных аб'ектаў, выклікалася ваенна-стратэгічнымі меркаваньнямі і паколькі ваенная авіяцыя, або хаця-б бамбардыровачная ў абсалютнай форме ня будзе забаронена, ня можа быць ніякай гарантыі і для грамадзянскага насельніцтва. Такім чынам, **гэты пункт ня можа мець сур'ёзнага значэньня і ва ўсякім выпадку, ня можа разглядацца, як сур'ёзны вынік шасьцімесячных работ канфэрэнцыі.**

На жаль, асноўнае пытаньне аб забароне бамбардыровачнай авіяцыі пастаўлен у рэзалюцыі ў залежнасьць ад умоў, якія яшчэ падлягаюць абмеркаваньню і ўгадненьню.

Хоць мы і ня ведаем дэталяй доўгіх, мучэльных і прыватных перагавораў па гэтым пытаньні, не зьяўляецца сакрэтам, што адносна гэтых умоў існуе сур'ёзнае разыходжаньне. Мне, такім чынам, здаецца заўчасным уключэньне гэтага пытаньня ў лік пунктаў, па якіх, нібы, дасягнута згода. **У рэзалюцыі нічога не гаворыцца аб зьнішчэньні ваеннай або хаця-б бамбардыровачнай авіяцыі, а між тым такая мера зьяўляецца адзіным эфэктыўным мэтадам забесьпячэньня спыненьня паветранай бамбардыроўкі.** Ня цяжка пракантраляваць зьнішчэньне таго ці іншага віду зброі, або выкрыць парушэньні забароны ў гэтай галіне, але наўрад ці можна быць гарантаваным ад яго выкарыстаньня ў часе вайны, наперакор канвэнцыі, калі забароненая зброя будзе фактычна захавана. Савецкая дэлегацыя, якая выказалася за поўнае зьнішчэньне ўсёй ваеннай авіяцыі, прапануе цяпер у якасьці кампрамісу прадугледзіць у рэзалюцыі ў ліку іншых мер зьнішчэньне, прынамсі, бамбардыровачнай авіяцыі.

Адносна танкаў і ціжкай артылерыі гаворыцца толькі аб абмежаваньні танажу і калібру наогул. Але, зноў-такі, супроць абмежаваньня наогул ніхто ніколі не пярэчыў ні па канфэрэнцыі, ні ў камісіях. Аднак, як толькі гутарка заходзіла аб лічбах, зьяўляліся разгалосьсі. У камісіях, напрыклад, прапанавалі абмежаваць танаж танкаў і калібр гарматаў такімі межамі, якія тэхнікай, або яшчэ не дасягнуты, або дасягнуты толькі ў стадыі эксперымэнтаў. Калі згода магчыма толькі ў такіх межах, дык было-б сьмешна падводзіць гэта пад скарачэньне ўзбраеньняў, якія існуюць.

Пытаньне аб колькасным раззбраеньні на канфэрэнцыі фактычна ня ставілася

Усе гэтыя пытаньні датычаць так званага **якаснага раззбраеньня.** Я ўжо меў выпадак указаць у гэтай камісіі, што якаснае раззбраеньне само па сабе азначае не скарачэньне ўзбраеньняў, не зьмяншэньне магчымасьці вайны, а значыць не азначае кансалідацыю міру, а рэгляментацыю вайны, новую распраноўку права вайны. Нас дэлегатаў канфэрэнцыі па раззбраеньні, павінна цікавіць якаснае раззбраеньне пастолькі, паколькі якасьць можа пераходзіць у колькасьць, або паколькі якаснае раззбраеньне зьяўляецца дапаўненьнем да колькаснага. Абмежаваньне танажу, калібру, або іншых характарыстык тэй ці іншай зброі ня можа даваць значных рэзультатаў у сэнсе колькасьці. Я дазволю сабе напомніць вам, што ўсе пастановы і запрашэньні, зьвязаныя са скліканьнем канфэрэнцыі па раззбраеньні, заўсёды разумеліся пад кутом гледжаньня колькаснага раззбраеньня, а ня якаснага. У падрыхтоўчай камісіі па раззбраеньні, напрыклад, пытаньне аб якасным раззбраеньні нават ня ўзьнімалася і ніякіх падрыхтоўчых дзеяньняў у гэтым напрамку ня ўжывалася. **Таму савецкая дэлегацыя лічыць асноўным дэфэктам рэзалюцыі адсутнасьць якіх-бы там ні было канкрэтных пастаноў аб колькасным скарачэньні ўзбраеньняў.**

Сабатаж пры дапамозе „прыватных перагавораў"

Нарэшце, з часу прадстаўленьня амэрыканскай прапановы прайшоў ужо амаль месяц, і калі-б генкамісія занялася адразу ўсутым гэтай прапановай, у нас маглі-б быць сур'ёзныя рэзультаты. Зноў-такі пры ўмове што дэкларацыі і абяцаньні, якія заключаюцца ў рэзалюцыі, што нам прапануецца, сапраўды адпавядаюць намерам прадстаўленых тут урадаў. Замест гэтага, на жаль, канфэрэнцыя і генкамісія фактычна перасталі функцыянаваць яшчэ месяц назад. Дэлегацыі былі асуджаны на поўную бязьдзейнасьць у чаканьні рэзультатаў нейкіх прыватных перагавораў. Рэзультаты гэтых нам цяпер вядомы: гэта — рэзалюцыя, якую я зараз разглядаю і якая пазбаўлена сур'ёзнай каштоўнасьці і зьяўляецца толькі паўтарэньнем такой-жа рэзалюцыі, прынятай яшчэ тры месяцы назад, аб тым, што пастаноўлена ажыцьцявіць рашучы этап па скарачэньні ўзбраеньняў. Тады меркавалася, што канфэрэнцыі неадкладна зойменца канкрэтызацыяй гэтай рэзалюцыі, але гэтага не адбылося, **і ўвесь сэнс рэзалюцыі, якая зараз прапануецца, заключаецца ў тым, што нам прапануюць адкласьці канкрэтызацыю надалей шыя 6 месяцаў.**

Усе гісторыя праблемы раззбраеньня ёсьць бесьперапынная сэрыя адкладваньняў і адсыпаньняў да прыватных перагавораў, прыватных канфэрэнцый. Калі прасачыць гісторыю падрыхтоўчай камісіі, дык мы ўбачым, што яна звычайна спыняла свае сэсіі і перарывала свае работы нязьменна са спасыланьнем на прыватныя перагаворы, прыватныя нарады і канфэрэнцыі, якія недзе адбываюцца і якія нібы павінны падрыхтаваць рашэньні на пытаньнях, што надзялялі камісію.

Камісія нязьменна зноў зьбіралася, каб канстатаваць бязвыніковасьць гэтых прыватных нарад.

Але ўсе гэтыя плённыя рэзультаты прыватных перагавораў і нарад нязьменна аказваліся зданьню, блукаючымі агнямі, як і зданьню ака заліся рэзультаты прыватных перагавораў, увасобленыя ў рэзалюцыі, што нам прапануецца. У гэтай рэзалюцыі, як мною толькі-што адначана, ёсьць або рашэньні, пастаўленыя ў залежнасьць ад умоў, якія складаюць прадмет глыбокіх разгалосьсяў, або агульныя ўказаньні па дасягнутыя згоды але мы на вопыце ўжо ведаем, што як часта мы разыходзімся на пытаньні аб тым, на чым-жа мы, уласна, згадзіліся?

Прапанаваная рэзалюцыя—не адказ, а ўтойваньне адказу

Праблема раззбраеньня стаіць перад дзяржавамі ва ўсіх яе канкрэтных асьпектах ужо на працягу 10 год. Пытаньне вывучана экспэртамі кожнай краіны ў камісіях і падкамісіях на ўсіх яго дэталях.

Урады ўсіх дзяржаў маюць зусім ясныя адказы на гэта пытаньне і савецкая дэлегацыя мяркуе, што настаў момант, калі гэтыя адказы павінны быць даны голасна і ні дзе-небудзь, а на канфэрэнцыі па раззбраеньні. Раззбраеньне павінна пакінуць адыгрываць ролю тэніснага мяча, які перакідваецца з аднэй камісіі, або падкамісіі ў другую, з аднэй канфэрэнцыі на другую, з аднэй сэсіі на другую. Праз 6 месяцаў адказ урадаў будзе той-жа, што і цяпер і нам няма чаго яго адкладваць. Рэзалюцыя, якая прапануецца, ня ёсьць адказ, а ўтойваньне адказу і таму ў цяперашнім выглядзе павінна быць адхілена.

Савецкая дэлегацыя лічыць з відавочным намерам канфэрэнцыі разьехацца ў бліжэйшыя-ж дні. Таму яна не прапануе уносіць новую рэзалюцыю і, наадварот, у духу супрацоўніцтва гатова прыняць за аснову цяперашнюю рэзалюцыю, калі ў ёй даны будуць канкрэтныя лічбовыя адказы хаця на намечаных у ёй пунктах.

Што прапануе савецкая дэлегацыя

Савецкая дэлегацыя прапануе па агульным пункце аб скарачэньні узбраеньняў, галоўным чынам, па асноўным пытаньні аб колькасным скарачэньні, **не абмяжоўвацца неакрэсьленымі дэклярацыямі, а зусім дакладна сказаць, што канфэрэнцыя рашае скараціць усе віды узбраеньняў ня менш, чым на адну трэць.** Савецкая дэлегацыя ў свой час прапанавала тое-ж скарачэньне наводле прагрэсыўна-парлямэнтарнага прынцыпу, лічачы справядлівым і палітычна мэтазгодным, каб найбольш магутныя дзяржавы скарачалі свае узбраеньні ў большай меры, чым іншыя дзяржавы, а іменна да 50 проц.

Не сустракаючы, аднак, спрыяючага водгуку на гэту прапанову і канстатуючы, што другая дзяржава, найпоўны насустрач савецкаму праекту, прапанавала скарачэньне ўсіх відаў узбраеньняў на адну трэцюю частку і што аб далучэньні да гэтай прапановы была зроблена заява Італіяй і некалькімі дзесяткамі другіх дзяржаў, савецкая дэлегацыя ў парадку практычнага кампрамісу гатова для першага этапу скарачэньня задаволіцца прапанаваным аб аднэй трэці. Савецкая дэлегацыя ня можа, аднак, згадзіцца на вынаходзе са скарачэньня паасобных часьцей узбросных сіл, прызначаных для паліцэйскай і калёніяльнай службы, бо гэтым пляхам створана было-б прывілейванае становішча для найбольш магутных дзяржаў, якія маюць калёніі, дзяржаў, якія, такім чынам, падпалі-б пад скарачэньне ў меншай прапорцыі, чым больш слабыя дзяржавы. **Савецкая дзяржава да таго-ж не магла-б далучыцца да дакумэнту, у якім фармальна санкцыянаваліся-б мэтады ажыцьцяўленьня імпэрыялістычнай і калёніяльнай палітыкі.** Далей савецкая дэлегацыя лічыла-б справядлівым і спадзецца, што супроць гэтага ня сустрэнецца сур'ёзных супярэчнасьцяй, каб найбольш слабыя дзяржавы, якія маюць ня больш 30 тыс. войск і 100 тыс. тон морскіх узбраеньняў, і

Савецкая дэлегацыя—на варце міру

Савецкая дэлегацыя поўнасьцю ўяўляе сабе тое, што яе папраўкі наўрад ці будуць прыняты аднагалосна, або хаця-б наўрад большасьцю галасоў. Калі яна тым ня менш настойвае на галасаваньні, дык яна зыходзіць з глыбокага перакананьня ў тым, што беспасьпяховыя міжнародныя канфэрэнцыі маюць глыбокае значэньне і даюць шмат павучальнага і карыснага матар'ялу для разуменьня разьвіцьця міжнароднага жыцьця, а таксама для палягчэньня згод на наступных канфэрэнцыях.

Але для таго, каб народы маглі браць гэтыя карысныя ўрокі з міжнародных канфэрэнцый, абсалютна неабходна, каб гэтыя канфэрэнцыі адбываліся зусім гласна, каб усе спрэчныя пытаньні абмяркоўваліся і галасаваліся гласна, каб ясны былі ня толькі пункты згоды, але і пункты разыходжаньня паміж народамі. Толькі гэтым шляхам мы можам прыцягнуць усе народы да суўдзелу ў міжнародным жыцьці, а гэты суўдзел асабліва неабходны для вырашэньня праблемы раззбраеньня. Мы ня можам гаварыць аб гласнасьці нашай канфэрэнцыі, калі на працягу трох месяцаў агульная камісія зьбіралася 5 разоў і ўся работа згуртавана была ў прыватных перагаворах некалькіх дэлегацый. Савецкая дэлегацыя выказвае надзеі, што на канфэрэнцыі яя будуць паўтораны гэтыя мэтады, якія закранаюць вартасьць дэлегатаў і мноства краін, да таго-ж неапрэдзанны рэзультатамі.

Савецкая дэлегацыя, натуральна, у першую чаргу заклапочана тым, каб зусім ясная была для народаў Савецкага Саюзу і іншых народаў пазыцыя савецкага ўраду у справе раззбраеньня, і каб з яе зьнята была ўсякая адказнасьць за адмоўныя або невыстарчальныя рэзультаты канфэрэнцыі. Яна спадзяецца, што яна гэтай мэты дасягнула, бо яна ніколі ня ўпускала выпадку заявіць і на ўсякі выпадак заяўляе цяпер зноў, што яна згодна на

Прапановы савецкага дэлегата Літвінава, якія накіраваны супроць вайны, выклікалі ня толькі пункты згоды, але і пункты разыходжаньня паміж народамі.

Савецкая дэлегацыя прапануе ня толькі пункты згоды, але і пункты разыходжаньня паміж народамі.

**Савецкая дэлегацыя ня можа, аднак, згадзіцца на вынаходзе са скарачэньня паасобных часьцей узбросных сіл, прызначаных для паліцэйскай і калёніяльнай службы, бо гэтым пляхам створана было-б прывілейванае становішча для найбольш магутных дзяржаў, якія маюць калёніі, дзяржаў, якія, такім чынам, падпалі-б пад скарачэньне ў меншай прапорцыі, чым больш слабыя дзяржавы